У Зубра ў Бабігары ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АЛЯКСАНДР УРБАНОЎСКІ ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 19 (2504) Год XLIX | Беласток, 9 мая 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Сем членаў хору „Расспяваны Гарадок” атрымалі ад польскага Міністэрства культуры адзнаку „Заслужанага дзеяча культуры” за выключныя заслугі для супольнай культуры Рэспублікі Польшча, а Ніна Цыванюк — ад беларускага Міністэрства культуры Нагрудны знак за ўклад у развіццё культуры Беларусі...

Фота ЮРКІ ХМЯЛЕЎСКАГА

Залаты юбілей

Крэслы ў Гмінным асяродку культуры імя Кастуся Каліноўскага ў Гарадку не змаглі памясціць гасцей. Атмасфера прыўзнятасці мяшалася з забавай ды гумарам. Так святкаваўся юбілей 50-годдзя „Расспяванага Гарадка”. Гераінямі свята былі дзевяць сённяшніх спявачак калектыву з мастацкай кіраўнічкай і паэтэсай Нінай Цыванюк на чале ды гарманістам і заадно музычным кіраўніком — Віктарам Маланчыкам. Усё ўспаміналіся і заснавальніцы групы з 1953 г. — Ніна Мушынская, якая пісала таксама тэксты, сярод іх — славутыя „гарадоцкія частушкі” ды бібліятэкарка Яўгіння Савіцкая. Зараз жа пасля заснавання калектыву, у якім спачатку займаліся 23 асобы, вылучылася з яго трыо: Ніна Мушынская, Ніна Цыванюк і Аляксандра Яроцкая. У канцы шасцідзесятых далучыўся да іх Юрка Налівайка, ветэран з-пад Монтэ-Касіна. Раней трапіў туды прафесійны музыка Сцяпан Копа. За 50 гадоў пракацілася праз гурт больш за 200 асоб. Ад пачатку спяваюць у ім Ніна Цыванюк ды Ірына Паўлючук. Першы канцэрт ансамбль, які спачатку называлі „Гарадком”, даў 8 сакавіка 1954 года. Колькі іх было да гэтай пары, нельга палічыць, канцэрты ідуць у тысячы. Дарэчы, быў бы клопат з пералікам узнагарод і вылучэнняў, якія атрымаў хор, які спяваў, апрача беларускіх, украінскія, рускія і польскія песні.

У дзень свята (24 красавіка) на сцэне, апрача юбіляраў, выступілі іх сябры: „Журавінкі”, „Хлопцы-рыбалоўцы”, „Асенні ліст”. Заспявала таксама маладое пакаленне: ад эстрадна-народных „Прымакоў” па фольк-рокавую „Ріму”.

„Расспяваны Гарадок” у новых касцюмах (ад гродзенскага аблвыканкама) праспяваў свае самыя папулярныя песні і адыграў культавыя ўжо тэатралізаваныя абрадавыя сцэнкі, як „Цыганка” (якую калісьці з поспехам іграла Ніна Мушынская), якая выклікае шмат радасці ў гледачоў не аднаго пакалення. Прыгожа сцэнічна афармленую ўрачыстасць, якая працягвалася больш за тры гадзіны, вяла Валянціна Ласкевіч, сакратар ГП БГКТ:

— Ёсць штосьці ў тым, што душа чалавека хоча паказаць усё, што наўкола яе, — прызналася.

Юбілей удастоілі саноўныя госці, а ў іх ліку — пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка. Зачытаў ён віншавальны ліст Савета Міністраў і ўручыў Ганаровую грамату, падпісаную прэм’ер-міністрам РБ Сяргеем Сідорскім за м.інш. узмацненне польска-беларускіх стасункаў і захаванне традыцыі па-за межамі Беларусі.

— Важныя — сэрца і душа. Мы — заўсёды з вамі і вамі ганарымся. Дзякуем за тое, што для нас зрабілі, — сказаў пасол Павел Латушка і пасля ўручыў спявачкам кампалект новых боцікаў, адмыслова пашытых у Мінску.

За 50 гадоў пракацілася праз гурт больш за 200 асоб. Ад пачатку спяваюць у ім Ніна Цыванюк ды Ірына Паўлючук. Першы канцэрт ансамбль, які спачатку называлі „Гарадком”, даў 8 сакавіка 1954 года. Колькі іх было да гэтай пары, нельга палічыць, канцэрты ідуць у тысячы...

У сваю чаргу генконсул РБ у Беластоку Леанід Каравайка ад імя беларускага міністра культуры Леаніда Гулякі ўручыў ганаровую грамату. З яго рук Ніна Цыванюк, якая, як адзначыла Валянціна Ласкевіч, прысвячаючыся калектыву, шмат начэй недаспала, атрымала спецыяльную адзнаку — Нагрудны знак за ўклад у развіццё культуры Беларусі. Ежы Завіша, дырэктар Дэпартамента нацыянальных меншасцей польскага Міністэрства культуры сямі членам хору ўручыў ад імя міністра Вальдэмара Дамброўскага адзнаку „Заслужанага дзеяча культуры” за выключныя заслугі для супольнай культуры Рэспублікі Польшча.

Ян Сычэўскі, як польскі чыноўнік падляшскай управы, падкрэсліў па-польску, спасылаючыся на здабыткі „Расспяванага Гарадка”:

— Крыніцы культуры нацыянальнасцей — невысыхаючыя. Чэрпае з іх уся нацыянальная культура.

Пасля, па-беларуску, віншаваў ужо як старшыня БГКТ і беларускі дзеяч.

— Гэтае багацце важнае таксама ў кантэксце задзіночанай Еўропы, — заўважыў таксама прадстаўнік падляшскага ваяводы.

Ніна Цыванюк не скрывала хвалявання:

— Дзякую за такую высокую ацэнку, — сціпла сказала мастачка, якую лідэр „Прымакоў” Юрка Астапчук жартоўна ды цёпла назваў *taką jajcarską babą*.

Кветкам, падарункам, віншаванням не было канца...

Сёння „Расспяваны Гарадок” складаюць: Ірына Паўлючук, Ніна Цыванюк, Тамара Бурачэўская, Галіна Ляховіч, Ніна Харужая, Марыя Врублеўская, Аліна Гобец, Галіна Дарашкевіч, Ганна Казбярук, Віктар Маланчык.

Мацей Халадоўскі

Марыянетачны свет ☞ 2

Яўген Міранові ч

Палітыкі і прапагандысты Польшчы фарміруюць сярод сваіх грамадзян вобраз Беларусі як краіны ў руках паяцаватага дыктатара. Беларусам тым часам паказваецца палякаў як народ гатовы, па загадзе амерыканскага вялікага брата, браць удзел у зняволенні любой краіны...

Апошнія дні ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Ну, і Польшча ўжо ў Еўрасаюзе. Пішу гэта крыху навырост, бо тры дні да факту. На пару дзесятак гадзін „да” назіраў я, што вакол мяне тварыцца, з пункту гледжання больш журналісцкага. Хадзіў я па Беластоку на розныя г.зв. імпрэзы з палітычным ухілам. Напачатку трапіў я на сустрэчу прэзідэнцкага кандыдата на прэм’ера праф. Марка Бэльку...

Адцятыя ад свету ☞ 4

Лукаш Баравы

Аж 32 цягнікі мелі перастаць курсіраваць на Падляшшы з 1 мая. Але некаторыя перасталі хадзіць раней, ужо ў красавіку. Напрыклад, той скарочаны (без адрэзка на Цісоўку) з Гайнаўкі ў Семяноўку. Меў быць заменены аўтобусам, які ездзіць ад чыгуначнай станцыі ў Гайнаўцы да будынка станцыі ў Семяноўцы...

Дні царкоўнай музыкі ☞ 5

Аляксей Мароз

Пакажуцца, блізкія нам прыхадскія вясковыя і гарадскія хоры, але будзе таксама прэзентацыя вялікіх прафесійных хораў. Сярод апошніх — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы, Хор Маскоўскага тэатра і аперэты „Масква”, Хор Універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі „Дняпро” з Кіева. Побач праваслаўных хораў выступяць таксама каталіцкія, якія выконваюць царкоўную музыку...

Школьніцтва ў Орлі ☞ 8-9

Міхал Мінцэвіч

Немцы, якія насталі тут у чэрвені 1941 года, дазволілі на існаванне 4-класнай школы з беларускай мовай навучання. Пры саветах вучняў вярталі на клас ніжэй, а пры немцах не навучалі ўсіх прадметаў...

Сход інтэлігенцыі ☞ 10

Віктар Сазонаў

Нягледзячы на запалохванні з боку ўлад беларуская інтэлігенцыя не пабаялася выявіць сваю грамадзянскую пазіцыю. У адмысловай рэзалюцыі было падкрэслена, што прайшоўшы год пасля першага форуму „адзначаны далейшым заглыбленнем краіны ў сістэму таталітарнай улады”...

9 770546 196000

Бі-бі-сі. Беларуска-беластоцкі слоўнік

Б — Баба-павітуха

У беларускай мове слова баба выпаўняе шмат якія функцыі. Стрэнеце бабу ў тэхнічным слоўніку (ударная частка механічнага молата), у кулінарным лексіконе (насычаны ромам кекс цыліндрычнай формы), а перш за ўсё — у штодзённым жыцці. На працы, на вуліцы, побач. Гэта ж і бацькава маці, і жонка, і жанчына наогул. А прытым можа быць „баба каменная" (старажытная статуя), як і зусім сучасная „снегавая баба". У бабах апынаюцца слабахарактэрныя, мяккія мужчыны, а вось „бой-бабам" або „хват-бабам" больш даспадобы афіцэрскае галіфэ за сукенку фірмы Дыёр.

Значыць — баба — неабавязкова пол чалавечага гатунку.

У штодзённым жыцці функцыянуе яшчэ „баба шалёная" — тлумачальны слоўнік акрэслівае яе як жанчыну з крутым характарам, але ў гэтым выпадку апошняе слова і так астаецца пры нашым, мужчынскім суб'ектывізме і нашых мужчынскіх эмоцыях. Могуць тады яны (суб'ектывізм і эмоцыі) абдорыць прыкметай шаленства кожную адну бабу — суседку, жонку, каханку, а своеасаблівая ўвага адводзіцца тут славутым цешчам.

Паколькі ўсе вышэйназваныя бабы трымаюцца здорава і ў ніякім выпадку не пагражае ім адыход у небыццё, значнейшую ўвагу прапаную засяродзіць на апошнюю ў гэтым перападліку — „бабу-павітуху". Яна якраз у нашай прысутнасці адступае ў мінуўшчыну.

Раней была такая баба ў кожнай вёсцы на Беласточчыне, ды карысталася вялікай пашанай мясцовага насельніцтва. У вясковай іерархіі, спакон вякоў змяшчалася, можна сказаць, на подыуме — зараз за бацюшкам і солтысам. А калі дадаткова ласкавы лёс абдорыў яе прыметамі бой-бабы, бесправлемна апярэджвала нават і гэтых чыноў.

Своеасаблівая пазіцыя бабы-павітухі мае саліднае абгрунтаванне — гэта ж яна, як першая, дакраналася да новага жыцця. І карысталася прытым адно сваім вопытам і сваімі сіламі. Рэкардсменка, якая на Беласточчыне вылузала на белы свет тысячы і тысячы малых беларусаў, пра свой занятак гаварыла так: „Дзяцей прымала толькі я і Бог, больш ніхто не быў патрэбны". Усё-ткі заслугі Усявышняга ўпамінаюцца тут ці не па звычайнай чалавечай сціпласці. За такім меркаваннем стаіць папулярны ў нашых вёсках доказ-абрад: прыняўшы роды, бабка-павітуха выходзіла на парог з запаленай свечкай, паведамляючы такім чынам Госпада Бога аб пашыраным на адну асобу крузе Ягоных рабоў, а Ён, у сваю чаргу (але не раней), запальваў на небе новую зорку.

Першы значны ўдар па — здавалася — волатаўскіх пазіцыях бабкі-павітухі нанесла дзяржава. Адбылося тое напрыканцы пяцідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя. У рэзультаце дзяржаўнага змагання супраць мала гігіенічных прывычак беларускай вёскі, усялякія „прыпечкі" і „запечкі" страцілі ранейшую функцыю. З выручкай прыйшлі ім радзільныя дамы і адукаваныя ў спецыялістычных школах акушэры. Так вось малы беларус нараджаўся ў бліжэйшым горадзе, а затым вяртаўся туды, дзе ніколі раней не быў. Значыць — у бацькоўскую вёску. Гэты факт, мабыць, адціскаўся кляймом на ўсе астатнія дні і гады ў ягоным жыцці. Пабачыўшы ўпершыню свет у мястэчку або горадзе, малады чалавек ставіў сабе адну мэту: вярнуцца да месца свайго нараджэння. Дзякуй спрыяльным умовам, якраз такая мроя здзяйснялася оптам.

І быў гэта чарговы, як бачым, смяротны ўдар па пазіцыі бабкі-павітухі. Прыстарэлая, апусташэлая вёска дае зараз сякі-такі занятак адно лістаношам, што раз у месяц абдзяляюць яе пенсіямі.

Але бабка-павітуха тут ужо ні пры чым. У лепшым выпадку яна таксама толькі кліент гэтых жа лістаношаў.

Міхась Андрасюк

У марыянетачным свеце

Няма тыдня, каб нехта з польскіх палітыкаў не назваў Беларусі марыянетачнай дзяржавай. Звяртаецца перш за ўсё ўвагу на залежнасць яе ўлад ад кіраўніцтва суседняй краіны. На пачатку красавіка па Інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што Польскае пасольства ў Мінску перадало пратэст міністру замежных спраў Беларусі, што такім самым тэрмінам акрэслілі Польшчу адзін з публіцыстаў беларускага тэлебачання. Меў ён на ўвазе поўную залежнасць Польшчы ад Амерыкі, што перш за ўсё відавочна ў справе акупацыі Ірака.

Палітыкі і прапагандысты Польшчы фарміруюць сярод сваіх грамадзян вобраз Беларусі як краіны ў руках паяцаватага дыктатара. Беларусам тым часам паказваецца палякаў як народ гатовы, па загадзе амерыканскага вялікага брата, браць удзел у зняволенні любой краіны.

У Вялікі тыдзень пачалося паўстанне іракцаў супраць акупантаў. У нямецкім і французскім тэлебачанні можна было пабачыць горад Фалуджа пацыфікаваны амерыканскімі войскамі. На вуліцах сотні забітых, у тым ліку дзяцей і жанчын. Іракцы гавораць, што няма ўжо каму займацца нябожчыкамі. У польскім тэлебачанні тым часам паказалі генералаў і палкоўнікаў, якія гаварылі пра сваю стабілізацыйную місію і неабходнасць змагання з „тэрарыстамі і крымінальнікамі". Тэрміналогія як з фільма пра нямецкую акупацыю Польшчы падчас II сусветнай вайны. Толькі тады такімі словамі карысталіся ўсялякія „штандартэнфюрэры" ў адносінах да польскага падполля.

Гандаль электроннымі дыскамі Міністэрства замежных спраў, які рассакрэціў тыднёвік Ежы Урбана „Не" паказвае абсурднасць утрымоўвання падаткаплацельшчыкамі арміі шматлікіх спецслужбаў, канфідэнтаў і даносчыкаў. Найбольш сакрэтныя таямніцы дзяржавы мог набыць кожны за сімвалічныя 10 злотых. Як даказвае Ежы Урбан, можна з выкрадзеных дыскаў прачытаць інфармацыі таксама пра прыватнае жыццё супрацоўнікаў міністэрства, у тым адрасы і асаблівасці характару каханкаў высокапастаўленых чыноўнікаў. Выглядае на тое, што тайныя службы асаблівую ўвагу прысвячалі накопліванню кампраматаў на паасобных чыноўнікаў. Праўдападобна не інакш выглядае сітуацыя ў іншых міністэрствах. Дзяржаву як рак з'ядаюць службы, канстытуцыйным абавязкам якіх было яе ахоўваць. Закалот вакол змены кіраўніцтва стратэгічнай для гаспадаркі краіны фірмы ПКН „Орлен" паказвае, што бяспека мела вырашальны голас у кадравай палітыцы дзяржавы.

На Беларусі кожны вучоны, журналіст, чыноўнік, прадпрымальнік пастаянна баіцца як яго ацэньваць будзе нейкая, ўсюдыісная, амаль оруэлеўская, улада. Страх гэты бывае стамляючы, стрымоўвае натуральную грамадзянскую актыўнасць. Улада, дзяржава, законы там аднак моцна персаніфікаваныя. Увасабленнем усяго з'яўляецца „ён". Такім кароткім тэрмінам называюць прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку. У вачах грамадзян „ён" адказны за ўсё, што адбываецца ў краіне, таксама за карумпаваных чыноўнікаў, паліцыянтаў і чэкістаў.

У Польшчы няма такога выразнага ўвасаблення ўлады. Тут вярнуўся традыцыйны падзел на „мы" і „яны". „Яны" гэта людзі пры ўладзе, якія прысвоілі сабе грамадскую маёмасць, а цяпер пастаянна сварацца над яе канчатковым падзелам. Для большасці палякаў Мілер, Ракіта, Качынскі, Кваснеўскі гэта адна і тая самая група, якая прывяла вялікую частку грамадзян у невыносныя сацыяльныя ўмовы. Настроі грамадства вельмі ўдала выкарыстоўвае Анджэй Лепэр, які ў кароткім часе пабудаваў магутны лагер, аб'ядноўваючы большасць фрустраваных і незадаволеных. Перспектыва перамогі „Самаабароны" прыцягвае да гэтай партыі твары добра ўжо знаёмых палітыкаў, найчасцей прайдзісветаў і няўдачнікаў. Іх перамену відаць толькі на патаўсцелых мордах. Але выступае вялікае праўдападабенства, што ў бліжэйшы час яны менавіта стануць аб'яўляць свету новую якасць палітыкі. А бяспека выцягне свае папкі з кампраматамі і ўсё стане на сваё месца.

Яўген Міранові́ч

Вачыма еўрапейца

Дні тыя апошнія

Ну, і Польшча ўжо ў Еўрасаюзе. Пішу гэта крыху навырост, бо тры дні да факту. На пару дзесятак гадзін „да" назіраў я, што вакол мяне тварыцца, з пункту гледжання больш журналісцкага. Хадзіў я па Беластоку на розныя г.зв. імпрэзы з палітычным ухілам. Напачатку трапіў я на сустрэчу прэзідэнцкага кандыдата на прэм'ера праф. Марка Бэльку з беластоцкімі самаўрадаўцамі і прадпрымальнікамі. Ягонае прэм'ерства — яшчэ пытанне. Польская сацыял-дэмакратыя Марка Бароўскага ўсё трымалася думкі, што павінна дайсці да ранейшых выбараў. Дарэчы, лідэры гэтай новай групоўкі дакляравалі ў Варшаве тое самае ў той час, калі ў Беластоку праф. Бэлька казаў:

— Давайце, спынім тыя мучэнні. Альбо аб'явім ранейшыя выбары, альбо назначым хутка новы ўрад, які будзе дзейнічаць прынамсі год.

За гэтым „прынамсі годам" выказваецца СЛД. Гэта, аднак, замала, каб урад Бэлькі ўзнік, а калі б нават хтосьці да Саюза далучыўся і працягнулася б уладанне кааліцыі СЛД-УП, было б гэта супраць палітычных адчуццяў. Згодна з імі мае ён падтрымку меншую чым у 7 адсотак, значыць, не дасягае выбарнага парога, які неабходны для таго, каб кааліцыя ўвайшла ў парламент. Незалежна ад таго Марэк Бэлька ў Беластоку адважыўся гаварыць аб сваёй выбарчай праграме. Сканцэнтраваў яе ў пяці пунктах, якія пры сённяшняй палітычнай атмасферы, нявыкрытых ці не да канца рассакрэчаных афёрах здаюцца быць маларэальнымі да ажыццяўлення на працягу „прынамсі года" ўрадам — як гэта акрэсліў праф. Бэлька — на канцоўку кадэнцыі. Гаворка аб змене сістэмы функцыянавання Фонду аховы здароўя, узмацненне пазіцыі Польшчы ў ЕС, ды „недэстабілізуючы выхад з Ірака", гаспадарлівае загадванне дзяржаўнай маёмасцю, добраўпарадкаванне фінансаў дзяржавы з улікам грамадскага фактара (дзяржава заплаціла б ЗУС прадпрыемствам, якія прынялі б на працу асобы, што былі даўжэйшы час беспрацоўнымі; ліквідаваны быў бы ўрэшце „стары партфель" пенсіяў), узмацненні стыпендыяльнай сістэмы.

— Мы на парозе сытых гадоў, хоць паляк патрапіць, але яшчэ можам усё зніштожыць.

Амбітная гэта праграма на першы год Польшчы ў ЕС. Амбітныя былі таксама леташнія бюджэт і дзеянні падляшскай ваяводскай управы. Падляшскія радныя дыскутавалі над імі і тым, ці даць абсалюторый управе на пяць дзён да ўваходу ў ЕС.

— Гаварылася аб стабілізацыі фінансаў і спыненні росту даўгоў, — пераконваў маршалак Януш Кшыжэўскі з кіруючага, кааліцыйнага клуба СЛД-ПСЛ-Падляшская народная ініцыятыва (былая „Самаабарона").

— У прапагандзе вы, панства, проста — геніі, асабліва пан маршалак, — грымеў Кшыштаф Путра з апазіцыйнага клуба ПО-ПіС.

Аднак, ад гэтай дыскусіі здаваліся быць важнейшымі ў кулуарах тлумачэнні віцэмаршалка Яна Камінскага. Здакляраваў ён, што ад чэрвеня не будуць ліквідаваны рэгіянальныя чыгуначныя спалучэнні. Управа выскрэбла на гэта больш за 6 мільёнаў.

На сесіі, быццам пры нагодзе абсалюторыя ўправе, якраз перад уваходам у ЕС, у сталіцы найдалей на ўсход высунутага рэгіёна Еўрасаюза, радны Зэнан Дзедзіц з ЛПР, вядомы поласеміт, абвясціў:

— Управа пакутуе г.зв. польскім комплексам. Нараджаемся і фармуемся ў лацінскай цывілізацыі, што на нас накладвае абавязкі. Управа, значыць, больш накіравана ў бок Бруселя чым Беластока ці Варшавы. Філабруселізм — небяспечны. Гэта апошнія дні свабоды Польшчы.

І гэтак далей, і да гэтага падобнае. Так, вось, у Беластоку ўваходзім у ЕС. З усім пеклам і недапешчаным багаццем. Не заглушаць гэтага нават выступленні найлепшых музыкаў на беластоцкіх Плянтах на еўрасаюзнае 1 Мая.

Мацей Халадоўскі

Не даць свае зямлі чужым, якім не ў смак наша культура на нашай зямлі. Калі аддамо кавалак за кавалкам, усё прападзе!

У Зубра ў Бабігары

Жывая повязь

У паўночнай частцы Белавежскай пушчы ляжыць вёска Бабігара (Babia Góra), распаложаная на двух узгорачках, аточаная з аднаго боку лясным комплексам, які стварае прыродны запаведнік „Семяноўка", а з другога боку распасціраецца даліна ракі Нарва і вадасховішча Семяноўка. Праз вёску вядзе „Бусловы шлях" да адлеглай на 500 метраў арніталагічнай вышкі, з якое можна назіраць водна-балотных птушак, якія шматліка насяляюць Семяноўку. Гэта апошняя мясцовасць з польскага боку даліны Верхняй Нарвы, далей ужо толькі — Рэспубліка Беларусь.

У Бабігары, на старым пляцы ад прадзеда Рыгора, дзе раней стаяла тыповая геэсаўская крама, Міраслаў Зубрыцкі чатыры гады таму пачаў ставіць дом. Для сябе і турыстаў. На Зубровым шляху — даў такое імя драўлянай хаце, някідкай знутры. Ды там заначаваць ды адпачыць можа 12 асоб. А падворак акаліў тыповым калісьці плотам з вецця.

— Пачалося гэта чатыры гады. Як пачалося, так і выйшла, — пачынае аповед Міраслаў, які толькі што на падворку цёр хрэн да велікодных

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Міраслаў Зубрыцкі

страў. —Нейкая энергія мяне агарнула. Меў намер купіць школу ў Рыбаках, але войт Міхалоўскай гміны прадаў яе нейкаму беластачаніну, артысту. Там яшчэ вокны дошкамі забітыя, а ў мяне — паглядзі. Сам усё гэта я парабіў. У мяне прафесій і талентаў хапае. Толькі цэнтральнае абаграванне спецыяліст рабіў, і архітэктар праект дома, па маёй задуме. Работы тут яшчэ многа. Ёсць і кухня, дзе турысты могуць сабе згатаваць, могуць заказаць і харчаванне. Рэцэптуры тутэйшыя, нашыя, ад вякоў. Хлеб — ад мае матулі, мяса таксама.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Мікола Зубрыцкі: Мірак, плот ты такі зрабіў несучасны. Сын М. Зубрыцкага Славік працуе ў консульстве РП у Маскве

Стараюся паказаць турыстам тутэйшы смак

Людзі прыязджаюць сюды такія, што не шукаюць чагосьці ў тыпе Аўгустова ці Закапанэ, якія „залічваюць" пад гумар ды залішне. Цікавыя людзі, вучоныя, зацікаўленыя знаёмствам з прыродай. Не хочуць быць дурнейшымі ў гэтым плане ад такога беларуса з Бабігары. Стараюцца пазнаць прыроду, глядзяць на яе шырокім вокам. Такія пойдуць у нясходжаныя закуткі. Некаторыя пытаюцца, чаму не раблю тут нейкага скансэна ці не выкапаю які басейн. **Мы тут маем усё** — добра захаваную рэчку, пушчу. Я базую на пушчы. Не трэба тут ніякіх збудаванняў, шляхоў ці каб штосьці выкопваць. Гэта ўсё наша багацце. Маем жывых людзей. Прыезджыя цікавяцца нашай архітэктурай, забудовай. А галоўнае іх зацікаўленне — пазнаць нашу культуру, нават і бліжэй у яе ўвайсці, у праваслаўе ці беларускую меншасць (пры Еўрасаюзе цяжка пазнаць, хто большы, хто меншы!). Прыязджаюць такія з Варшавы, самі шукаюць беларускіх песень, спяваюць. Я сам падкідваю ім спеўнікі. Трапляюць людзі нават з далёкай Іспаніі, шмат было немцаў, крыху галандцаў, француз, амерыканец. Я спецыяльна да іх загаворваю па-свойму, часам на іх здзіўленне, дык кажу адразу: на нашай вуліцы людзі нармальна гамоняць па-беларуску, дык вучыцеся... І гармонік зайграе, і, скажам, „Дубіны" прыедуць. Нашы людзі не бачаць таго, што трэба не ўпадабняцца, а ўшаноўваць сваю культуру. Калі да нас чалавек ужо прыехаў, значыць, выбраў. —Вось, пастаянныя наведвальнікі нашага стороння, — гаспадар паказвае багаты збор здымкаў, выкананых, пакінутых ці дасланых імі. — Яны, гледзячы збоку прафесійным часам вокам убачаць такое, што сам, бывае, не прыкмеціш. Вось партрэт Лявона Лукшы, твар паараны лёсам. Гісторыя на ім. Вось, натуральны брук на нашай вуліцы (а масяўчане так змагаліся за асфальт...). Вось месца на Варанаборскай, званай яшчэ Вялікай, дарозе, тамака, дзе пад зямлю праваліласяя царква. Вядома, легенда. Такое і расказваем, і паказваем.

Я вярнуўся сюды

як чалавек, які тое, што найважнейшае, страціў. Жонка спачатку была талерантная, але ўсё змянілася. Але ёсць Бог, які таго, хто верыць, не пакіне. Не адчуваю сябе самотным. Маю надзею, што дзеці захочуць бацькаву культуру пазнаць. Але з таго боку — закрытасць.

Цікавіць мяне, як успрымаюць людзі, таксама і нашы, маю працу, заканчэнне дома. Я марыў усё зрабіць у драўніне. Дрэва нельга забіць. Трэба, каб было відаць натуральную дошку. Пакуль што, вучуся. Гэтых пару гадоў — някепская школа, даведацца, чым можна прыцягнуць людзей. Як прадаваць, як рэкламаваць. Натура натурай, але людзі хочуць усяго — і хлеба, і нашай кашанкі з печы, і кумпяка. Некаторым цікава нават карову ці свінку ўбачыць. Каб натуральна, і каб традыцыя не калацілася з сучасным. Думаю, што гэта такая „штука" ўсіх людзей, якія займаюцца агратурызмам, так выкарыстаць нагоду, каб турыст не толькі пажыў ды адпачыў, але каб і хлеб, і добра ўсоленую саланіну купіў, кумпяк. Гэта нагода зарабіць і суседзям. Нашы людзі шмат чаго пагубілі ў войнах, у бадзянні па свеце ў пошуках хлеба і даху, але шмат і захавалі.

Вярнуўся, мабыць, можа не ўдалося? Можа, думалі, спрабуе гаспадарыць? Але ўбачылі, што кароў не купляю, а штосьці іншае „камбіную"— досыць, здаецца, цяжка ўспрынялі навіну. Некаторыя глядзяць іначай, хто, можа, і з зайздрасцю. Я людзей люблю, люблю паразмаўляць, сам адкрыць свае думкі. Хоць некаторых не пазнаю. Быццам у той „Канапельцы" Рэдлінскага, з тою касою, што замянілі серпік. Для мяне на першым месцы: каб традыцыя, каб захаваць мову, культуру ўзмоцніць. Думаю, што ў гэтым я рэалізуюся лепш, чым доячы кароў.

Можа, трактуюць мяне як дзівака. Быў за граніцамі, быў і па ўсёй Польшчы. Мабыць, смяяліся з мяне, калі купіў я той стары „склеп", стаў тут жыць. Можа, хто думаў, што ўсё жыццё буду так жыць?

Будзе тут развівацца агратурызм, згодна з прыродай і з намі, людзьмі. Тут работы на ўсіх хопіць. Не глядзець адны на адных, як на ворагаў, а ўзяцца за работу. Калі ёсць такія перамены, што трэба хлеб самому пячы, дык трэба пячы. Каапераваць — хто яйка дасць, хто малако. Гэта каштуе, але і смак мае. Сярэдняе пакаленне ўзяло сваю спадчыну. Не даць свае зямлі чужым. Варшавякам, якім не ў смак наша культура на нашай зямлі. А наступнае іх пакаленне скажа: „А дзе тут былі якіясь беларусы?" Калі аддамо кавалак за кавалкам, усё прападзе!

Я на гэты плот даю гарантыю 40 гадоў. Памятаю, меў я 5-6 гадоў, гуляў прутамі ў плоце, узіраўся, як яны ўкладзены, сплецены. Гэта ўсё застаецца жывое дрэва.

Міра Лукша

Міраслаў Зубрыцкі з маці Марыяй ды Яўгінняй Боўтрык з Боўтрыкаў

Добрае самаадчуванне ад паказчыкаў

У другой палове красавіка прэм'ер-міністр Лешак Мілер двойчы выступіў па тэлебачанні. За першым разам кіраўнік урада заявіў, што ён ганарыцца далучэннем Польшчы да Еўрасюза, якое канчаткова ажыццявілася пры яго знаходжанні пры ўладзе. Выступаючы другі раз (і апошні, бо 2 мая ўрад падаўся ў адстаўку) Мілер пераконваў народ, што ў нас добра жывецца, а доказам гэтаму — пяціпрацэнтны рост валавога даходу і стварэнне новых месц працы.

У прэм'ера добрае самаадчуванне ад станоўчых статыстычных паказчыкаў, якія, відаць, засланяюць яму сапраўдны вобраз становішча, у якім апынулася наша грамадства. Ці ж ён не бачыць бядны і нэндзы ў народзе? Людзі не маюць працы і штораз больш беспрацоўных вымушаны шнырыць па сметніцах у пошуках металалому і банак з-пад піва, якія можна прадаць па 17 грошаў за кілаграм. Многім людзям гэта адзіная крыніца заробку. А як пражыць пенсіянеру за 600 зл. у месяц? Чаму не ўвесці закону аб забароне працы для пенсіянераў, каб беспрацоўных не пазбаўляць занятку? Можна прывесці шмат прыкладаў, што былыя паліцыянты ці шафёры грамадскага транспарту з высокімі пенсіямі прымаюцца на працу ў якасці сторажаў. Ці гэта былі тыя новыя месцы працы, аб якіх згадваў Мілер?

Ці ж пяць мільёнаў беспрацоўных гэта таксама гонар уступаючаму ўраду? Няўжо няма ў Польшчы людзей, якія сумелі б выцягнуць краіну з так бядотнага становішча.

Дзядзька Захар

Ці гэта праўда?

Аднойчы наведаў мяне чалавек, які працуе на адказнай пасадзе ў Беластоку, а ягоная жонка мае ларок на базары па вуліцы Кавалерыйскай. Калі пайшла гутарка пра грамадзян з-за ўсходняй мяжы, што гандлююць спіртным, дык даведаўся, што беластоцкае прадпрыемства „Польмос" высылае свой прадукт у краіны СНД па 4 долары за 1 літр. Я гэтаму не паверыў, але чалавек той нават пабажыўся. І таму рускія гандляры прывозяць да нас спірт, тут яго разрабляюць і на базары прадаюць па 8 злотаў за бутэльку. А калі едуць па вёсках, дык прадаюць яе ўжо па 10 зл.

Ці ж гэта праўда, што беластоцкае прадпрыемства амаль дарэмна пхае за граніцу свой тавар? Калі так, то і тут на таўкучках улады не павінны забараняць гандляваць грамадзянам СНД. Яны ж наш айчынны тавар прывозяць назад і прадаюць палякам намнога танней чым у магазінах. Падумайце чыноўнікі ды перастаньце забараняць гандляваць нашым таварам. Напэўна тады самі з кіёчкамі пойдзеце ў Еўрасаюз.

Мікалай Лук'янюк

Адцятыя ад свету

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Цяжка разбіць манаполію ПКП. Летась чыгуначнікі і самаўрадаўцы тэставалі рэйкавыя аўтобусы. Прадказвалася, калі паявяцца яны на пуцях. Лакальныя спалучэнні цяпер у распараджэнні самаўрадаў. Мелі быць падпісаны дамовы з перавозчыкамі, але няма як падпісаць гэтых паразуменняў. Самаўрады не маюць грошай, а ведамства транспарту не выдала ліцэнзій іншым перавозчыкам чым ПКП. Канкурэнцыя сярод транспартнікаў мела ўплываць на цану паслуг. Але толькі манапалістычнае ПКП мае дакумент на перавозы. Пакуль што, самаўрадаўцам трэба дамаўляцца з манапалістам, што, як адзначаюць, не такое лёгкае.

Польская чыгунка пераходзіць рэструктурызацыю. Сітуацыя яе — трагічная. Доўг прадпрыемства перавышае 6 мільярдаў злотых. Чарговыя крэдыторы дамагаюцца пагашэння даўгоў. Рэструктурызацыя ПКП звязана з аддаўжэннем прадпрыемства дзяржавай. Выдзеленыя суполкі не справяцца, калі пойдуць за імі старыя даўгі. Забавязанні будуць заменены на акцыі і ўдзелы, якія пяроймуць крэдыторы. Найбольшая праблема — звальненні працаўнікоў. Якраз пагроза рэдукцыяй выклікае найбольшую апаску некаторых чыгуначных прафсаюзаў. У найбліжэйшыя гады рэдукцыя ахопіць больш за 40 тысяч працаўнікоў чыгункі. Тыя, каго будуць звальняць, могуць пакарыстацца перадэмерытальнымі пенсіямі, чыгуначнымі водпускамі і атрымліваць безумоўныя адправы. Сярод чыгуначнікаў — шмат жыхароў мястэчак і вёсак, асабліва тых, што „стаялі на чыгунцы", як Чаромха ці Семяноўка. А закрыванне нерэнтабельных шляхоў — адна з магчымасцей ашчаднасці ПКП. Магчымасць нармальнага функцыянавання жыцця на Усходняй сцяне цікавіць, аднак, перш за ўсё звычайных жыхароў, якім трэба ездзіць у школу і на працу, а не толькі самаўрадаўцаў ці саміх чыгуначнікаў ды іхных начальнікаў. Тэма адмены курсіравання цягнікоў праз кожныя пару месяцаў гучыць у мясцовых СМІ. Сустракаюцца самаўрадаўцы з кіраўніцтвам ПКП, праз рахункі спачатку адміністрацыйнай улады, пасля самаўрадавай, ідуць грошы на рахунак ПКП, дзеля працягу курсіравання „нявыгадных" цягнікоў. Аб якасці паслуг ужо і не гаворыцца.

Аж 32 цягнікі мелі перастаць курсіраваць на Падляшшы з 1 мая. Але некаторыя перасталі хадзіць раней, ужо ў красавіку. Напрыклад, той скарочаны (без адрэзка на Цісоўку) з Гайнаўкі ў Семяноўку. Меў быць заменены аўтобусам, які ездзіць ад чыгуначнай станцыі ў Гайнаўцы да будынка станцыі ў Семяноўцы. Трапілася мне нагода праехацца гэтым аўтобусам. Меў ён адпраўляцца ў 7^{15}. Адышоў у 7^{00} (як сказалі САКісты, ён тыпова працаўнічы, бо ездзяць на ім самі чыгуначнікі), бо сабраліся ўсе тыя, хто меў ехаць у Гайнаўку, да таго не са станцыі, а з-за барака, з месца, якога не відаць з таго боку, на пясчанай дарозе, якая вядзе да асфальтавай шашы. Так мне і не ўдалося праехацца чыгуначным сапраўдным аўтобусам.

ПКП заявіла, што адмяняе цягнікі ў ваяводстве, датуль, пакуль не будзе падпісана дамова паміж Прадпрыемствам рэгіянальных перавозаў і ваяводскай маршалкоўскай установай. Адменена была частка спалучэнняў у напрамку Элку, Сувалкаў, Чаромхі. Найцяжэйшая сітуацыя была ў пасажыраў Чаромхі і Гайнаўкі. Гайнавянам, пасля ліквідацыі спалучэнняў з Белавежай, Бельскам і Беластокам засталіся былі толькі курсы ў Семяноўку, Варшаву і Седльцы. Стратныя былі б таксама пасажыры на шляху ў Кузніцу. Шмат якія мясцовасці былі б проста адцяты ад свету.

Рэгіянальныя перавозы патрабавалі больш за 15 млн. зл., а маршалак мог пералічыць толькі 6,6 млн. злотых. Чыгуначны прафсаюз заявіў аб страйку, бо чарговыя ліквідацыі цягнікоў гэта таксама страта месцаў працы чыгуначнікамі. Ці гэта не шантаж манапаліста? Паводле разлікаў самаўрада, можа хапіць гэтых больш за 6 млн. злотых, якія ў ягоным распараджэнні. Невядома, якія будуць уплывы з падаткаў ад жыхароў і якімі грашыма будзе распараджацца самаўрад.

26 красавіка прадстаўнікі ПКП з ваяводскай управай сустракаліся коратка, каб на наступны дзень падпісаць дамову ад 1 студзеня да 30 чэрвеня г.г. На гэты час Рэгіянальныя перавозы атрымаюць тыя 6,6 млн. зл., раней зацверджаныя сеймікам. Маршалак даручыў адной з варшаўскіх фірм падрыхтаваць даныя на тэму ліку падарожнікаў, якія карыстаюцца паасобнымі спалучэннямі на тэрыторыі ўсяго ваяводства. Наступныя перамовы — на чарговае паўгоддзе — будуць весціся ў чэрвені. Прадстаўнікі чыгункі разлічвалі на лепшую дамову. Суполка Рэгіянальныя перавозы ад 1 мая ўводзіць новыя білетныя тарыфы (на 3,34%). Да 40 км, пакуль што, не.

Лукаш Баравы

Энергаэлектралінія Гродна — Беласток

Дэлегацыя кіраўнічага саставу з Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта сустрэлася ў Беластоку з ваяводскімі падляшскімі чыноўнікамі, м.інш. з ваяводам Маркам Стшалінскім. Была гэта першая і двухдзённая сустрэча на гэтым узроўні ў гэтым годзе.

— Замала такіх сустрэч. Як найбольш устаноў павінны часцей дыскутаваць, — сцвердзіў ваявода ў час прэс-канферэнцыі, якая не карысталася вялікім зацікаўленем беластоцкіх медыяў.

Гродна і Гродзенская вобласць супрацоўнічаюць з Беластокам і Падляшскім ваяводствам м.інш. у рамках еўрарэгіёнаў „Нёман" і „Белавежская пушча" і пастаянных міжурадавых камісій. Па-за дакларацыямі мала што з гэтага вынікае, асабліва цяпер, калі па польска-беларускай мяжы будзе прабягаць мяжа Еўрасаюза. Тым не менш пасля беластоцкай сустрэчы ваявода Стшалінскі дакляраваў:

— Мы жывем побач сябе. Гэтая блізкасць абавязвае да паправы якасці жыцця па абодвух баках мяжы.

У час спаткання былі абмеркаваны галоўным чынам прынцыпы функцыянавання гродзенскай і беластоцкай устаноў і змен, якія наступяць у гэтым плане пасля ўваходу Польшчы ў ЕС. Пры нагодзе, аднак, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Міхайлавіч Малец у размове з журналістамі падкрэсліў неабходнасць развязкі праблемы перамяшчання цераз мяжу грамадзян асабліва ў г.зв. памежнай зоне. Пакуль што, усе дамоўленыя палягчэнні былі адменены.

— Мусім задумацца, што рабіць, каб без перашкод перасякаць мяжу.

Іншай праблемай, якая ляжыць у полі зацікаўлення чыноўнікаў абодвух рэгіёнаў — завяршэнне дамовы аб рэканструкцыі для турыстычнага руху Аўгустоўскага канала ды неабходнасць узаемнага інфармавання аб надзвычайных, крызісных сітуацыях. Беларусаў, — як адзначыў У. Малец, — цікавіць таксама польская мадэль прыватызацыі прадпрыемстваў.

„Ніва" асабліва пацікавілася ідэяй пабудовы электралініі Гродна — Беласток, што было прадметам размоў на пачатку красавіка ў Мінску ў час пасяджэння польска-беларускай змешанай камісіі па справах эканамічнага і гандлёвага супрацоўніцтва. Прынялі былі ў ёй удзел віцэ-міністр гаспадаркі Яцак Пяхота і ваявода Марэк Стшалінскі, а з беларускага боку — намеснік прэм'ера Андрэй Кабякоў. Як тлумачыў на беластоцкай прэс-канферэнцыі Марэк Стшалінскі, ідэя ўзнікнення такой лініі выйшла ад беларускага боку. Справа ва ўзаемным забеспячэнні пераплыву электраэнергіі ў гадзіны пік, якія не накладваюцца адна на адну ў абедзвюх краінах у сувязі з розніцай часу. Ці гэта, аднак, не пагражае энергетычнай бяспецы з польскага боку мяжы, як здарылася пасля стрымання паставак газу з Расіі ў Беларусь і далей у Польшчу і Нямеччыну? Ваявода адказаў:

— На гэты конт мы досыць самазабяспечаны. Гэта толькі яшчэ адна спроба дыверсіфікацыі [здабыцця шматлікіх крыніц] паставак энергіі, чым больш зацікаўлены беларусы, падобна як і іншымі крыніцамі паставак газу.

— Хто сфінансуе пабудову гэтай лініі? — дапытваліся мы.

— Я не ў змозе на гэта адказаць, — шчыра прызнаўся падляшскі ваявода. ***(мах)***

Разнароднасць хораў

Размова з дырэктарам арганізаванага ў Гайнаўцы Міжнароднага фестывалю „Дні царкоўнай музыкі", мітрафорным протаіерэем Міхаілам НЕГЯРЭВІЧАМ.

— Ужо трэці раз пад Вашым кіраўніцтвам будзе арганізавацца з 9 па 16 мая ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы фестываль царкоўнай музыкі. Што новага падрыхтавана на сёлетняе мерапрыемства?

— Сёлетні фестываль не будзе адрозніваццa ад выпрацаванай у мінулых гадах мадэлі. Будзе праводзіцца конкурс хораў, якія выконваюць царкоўную музыку. Тое, што будзе вылучаць сёлетняе мерапрыемства, гэта вялікая колькасць хораў — 35 — і іх разнароднасць. Пакажуцца, блізкія нам прыхадскія вясковыя і гарадскія хоры, але будзе таксама прэзентацыя вялікіх прафесійных хораў. Сярод апошніх — Дзяржаўны хор Рэспублікі Беларусь імя Рыгора Шырмы, Хор Маскоўскага тэатра і аперэты „Масква", Хор Універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі „Дняпро" з Кіева. Побач праваслаўных хораў выступяць таксама каталіцкія, якія выконваюць царкоўную музыку, між іншым, Хор Каталіцкага Люблінскага універсітэта і Юнацка-мужчынскі хор „Pueri Consonantes" з Вроцлава. Цікавым будзе напэўна афрыканскі хор з Ганы „Kyerematen", які спявае рэлігійную музыку.

— Са сказанага відаць, што сёлета выступіць больш неправаслаўных хораў.

— Гэта сведчыць, што царкоўнай музыкай цікавяцца розныя свецкія хоры. Цяжка гаварыць аб папулярнасці царкоўнай музыкі, але яе прыгажосць спрычыняецца да таго, што яе спяваюць і слухаюць. У час фестывалю будзем прэзентаваць высокія мастацкія вартасці царкоўнай музыкі і знаёміць з нашым рэгіёнам і праваслаўем людзей з усяго свету.

— З якіх краін выступяць замежныя хоры?

— Да нас прыслалі заяўкі ажно 14 хораў з Расіі і з іх ліку мы выбралі чатыры. З Беларусі таксама выступяць чатыры хоры, з Украіны — два і па адным хоры з Балгарыі, Румыніі, Фінляндыі і Ганы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч

— У мінулым Вы звярталі ўвагу на згоднасць рэпертуару з царкоўнымі канонамі. Ці трэба было сёлета адкідаць творы, якія не трымаліся царкоўных канонаў?

— Хоры прысылалі нам заяўкі з запісанымі творамі. Мы іх праслухалі і не заўважылі большых памылак. Аднак узнікла небяспека, што могуць выступіць хоры з неканонічных Цэркваў Украіны і Балгарыі і мы звярталі ўвагу на прыхадскія хоры з гэтых краін. Свецкія хоры таксама павінны трымацца царкоўных канонаў, якія не дазваляюць адвольна інтэрпрэтаваць прэзентаваную музыку.

— Якія мерапрыемствы будуць спадарожнічаць фестывалю?

— Члены конкурснай камісіі пасля прэзентацыі музыкі будуць сустракацца з дырыжорамі і працаваць з імі ў напрамку павышэння ўзроўню выступлення хораў. Будзем арганізаваць канцэрты ў прыходах, між іншым, у Гайнаўцы, Бельску і Варшаве. Плануем арганізаваць выстаўку цэркваў і літургічнага аблачэння.

— Арганізацыя міжнароднага фестывалю патрабуе шчодрых спонсараў. Якія ўстановы выдаткуюць найбольш сродкаў на арганізацыю мерапрыемства?

— Самымі вялікімі нашымі спонсарамі з'яўляюцца Маршалкоўская ўправа ў Беластоку, Павятовае староства ў Гайнаўцы, Гарадская ўправа ў Гайнаўцы і многія гмінныя самаўрады. Сярод прадпрыемстваў найбольш грошай перадалі нам управы Гайнаўскага аддзялення Дрэваапрацоўчага прадпрыемства „Фортэ" і суполка „Пронар" з Нарвы.

— А што з Міністэрствам культуры, якое ў мінулых гадах фінансавала арганізацыю фестывалю?

— Мы здзіўлены паводзінамі чыноўнікаў Міністэрства культуры. Падалі мы прашэнне ў міністэрства і спачатку атрымалі вусную дакларацыю фінансавай падтрымкі арганізаванага намі фестывалю. Аднак пасля не было ніякага адказу на наша прашэнне. Хаця звярталіся мы з запытамі ў міністэрства, не атрымалі ніякіх паясненняў.

— У мінулых гадах многа асоб дапамагала арганізаваць фестываль.

— Так, многа асоб ангажуецца ў арганізацыю нашага мерапрыемства, але будзем рады дапамогай новых асоб.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Шаноўная рэдакцыя!

Дзякуючы спагадзе Віктара Буры з Гайнаўкі, у мае рукі трапіла некалькі выданняў Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва". І хаця я вывучаў беларускую мову толькі ў першым класе Пачатковай школы ў Круглым Ляску больш за 60 гадоў таму і прайшло ўжо 50 гадоў з таго часу, калі я пакінуў родную Беласточчыну, аднак з чытаннем і разуменнем гэтых публікацый у мяне няма праблемы (пісанне даецца горш).

Так яно атрымалася, што ўжо больш за паўстагоддзя жыву на заходне-паўночных землях краіны, а родныя старонкі апошнім часам наведваю раз у год і тады размаўляю па-беларуску, а дакладней кажучы на мясцовай гаворцы. Цяжка мне зразумець тых, якія, толькі выхіліўшыся „за мяжу", страчваюць уласную мову і нават да сваіх старых бацькоў „пшэкаюць", часта непапраўна, быццам бы забылі родную гаворку. Гэта рыса людзей слабых і вельмі „малых", проста „мікробаў", якіх слушна папракае Сакрат Яновіч.

Чытаючы ягоныя „Дзённікі", усведаміў я веліч працы ўкладзенай беларускімі дзеячамі ў 1987-1995 гадах у працэс „абуджэння" нашага народа. Гэтая праца павінна даць плён, хаця цяжка сказаць калі. Асіміляцыя і паланізацыя паступова ўзмацняюцца, асабліва ў адносінах да асоб расцярушаных па ўсёй краіне, але ў месцах кампактнага пражывання данай нацыянальнай меншасці гэтыя працэсы трэба прытарможваць. Напрыклад, на Беласточчыне, дзе польскі нацыяналізм найбольш правінцыйны і заядлы. У гэтым мог я пераканацца, публікуючы артыкул аб генерале Міхале Полеху ў гміннай газеты ў Міхалове. Там яшчэ не дайшла цывілізацыя, а мясцовы польскі нацыяналізм — зусім дзікі. Адазвалася, напрыклад, малая група людзей, якая з дапамогай рэдактара газеты аплявала, прытым пасля смерці, высакароднага чалавека, якім быў заснавальнік і дырэктар Міхалоўскага прафтэхвучылішча Сымон Зіневіч. Не ўступіў я ў палеміку з імі, бо для гэтага патрэбны партнёр, а не нешта падобнае на стоўб для аб'яў. Яшчэ раз хвала Сакрату Яновічу, што кляймуе такіх стаўбоў, нягледзячы на гучанне прозвішчаў.

Усцешыла і ўзрушыла мяне кніга „Пакаленне вайны" з цікавым уступам Яўгена Мірановіча, у якім зрабіў ён вельмі трапны аналіз тадышніх грамадскіх, рэлігійных, палітычных і гаспадарчых адносін. Задума ўвекавечання ўспамінаў звычайных людзей, адыходзячых з гэтага свету, геніяльная! Такім чынам выказванні пагарджаных сялян апынуліся ў літаратуры і папоўнілі гістарычныя крыніцы. І нават калі яны не заўсёды дэталёвыя, напрыклад, аповед Лапінскага ў справе Полька, то і так агульны вобраз паказвае сапраўднае жыццё і пакуты нашага народа ў той ваенны час.

Я свядомы таго, што мае заўвагі могуць аказацца не надта трапнымі, бо я не гуманіст і не гісторык. Мая прафесійная праца была накіравана на тэхнічныя пытанні. У гэтай дзялянцы я трохі публікаваў у краіне і за мяжою, удзельнічаў у сусветных кангрэсах.

Я асабіста адчуваю дыскамфорт з-за адсутнасці свайго ўкладу ў беларускую справу, якую ў маладосці рабілі мы з Міхалам Полехам у Міхалове.

Лявон Васько, Кашалін

Ад рэдакцыі: *Уключыцца ў беларускую справу ніколі не позна. Прапануем стаць нашым карэспандэнтам і апублікаваць Вашы ўспаміны з міхалоўскага і пазнейшага перыядаў.*

„Наша хата"

Актыўна дзейнічае Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі (ТПНЗ) у Нараўцы (Гайнаўскі павет). Заснавалі яго ў сакавіку 2003 года. Старшынствуе яму Вольга Зданоўская-Місяюк. У мінулым годзе ТПНЗ арганізавала агляд кінафільмаў Тамары Саланевіч летнім вечарам у нараўчанскім амфітэатры, а таксама летні баль для членаў і сімпатыкаў таварыства. У мерапрыемствах удзельнічалі ўраджэнцы Нараўкі, якія зараз пражываюць у Варшаве, Беластоку, Любліне, Зялёнай Гуры і ў іншых гарадах Польшчы.

Сёлета, 16 красавіка ў Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы адбылося падсумаванне конкурсу „Нараўчанская зямля ў мінулым, цяпер і ў будучыні" і ўручэнне ўзнагарод пераможцам. У катэгорыі дакументальнага рэпартажу першынство заваявала Ядвіга Карпюк з Нараўкі, у катэгорыі фотарэпартажу — Марцін Шульжыцкі з Варшавы і ў катэгорыі пластычных прац — група юных жывапісцаў з Гайнаўскага дома культуры, якая працуе пад кіраўніцтвам Зінаіды Якуць. Пасля ўручэння ўзнагарод, з багатай мастацкай праграмай выступіў беларускі калектыў „Нараўчанкі" ў прыгожых нацыянальных касцюмах, які працуе пад кіраўніцтвам Пятра Скепкі. Гурт спяваў (выканаў васемнаццаць песень) і танцаваў. Усім спадабаўся.

Зараз ТПНЗ плануе заснаваць этнаграфічны міні-музей „Наша хата". Для гэтага ёсць у Нараўцы адпаведны будынак. У ГАК ёсць загадзя з гэтай мэтай сабраныя этнаграфічныя экспанаты.

Члены і сімпатыкі ТПНЗ намераны шмат што рабіць, каб жыццё жыхароў Нараўчанскай гміны было цікавейшым, лепшым і прыгажэйшым. Мае гэта сваё адлюстраванне ў прыгожай хроніцы дзейнасці таварыства. Ужо цяпер варта адзначыць ахвярную працу ў рамках ТПНЗ Вольгі Зданоўскай-Місяюк, Анны Стульгіс, Алімпіі Павільч, Мікалая Павільча, Кацярыны Бяляўскай і іншых асоб.

(яц)

Непрэстыжная дарога

Міхалова ўступае ў Еўрапейскі Саюз. Гэта відаць простым вокам. У гмінным цэнтры вядуцца рамонтна-будаўнічыя працы. На вуліцах пракладаюцца трубаправоды для сцёкаў, насцілаецца асфальт на дарожнае палатно.

Але пра дарогу ў Падазераны ні гмінныя, ні павятовыя чыноўнікі ўжо не дбаюць. Яе стан такі дрэнны, што шафёры, едучы ў гэтую вёску з боку Міхалова, лаюцца апошнімі словамі.

Мабыць, калі б гэтая дарога вяла ў заходнім напрамку, у бок Еўрасаюза, яе адрамантавалі б да 1 мая, да ўступлення Польшчы ў ЕС. На жаль, па гэтай дарозе можна падацца толькі на ўсход, у Рэспубліку Беларусь. Відаць таму няма ў дарожнікаў цікавасці да дарогі ў непрэстыжным напрамку.

(дз)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Толькі раз не было буслянят

У Дубічах-Царкоўных тры бусліныя гнёзды. Мы рашылі распытаць пра буслоў іх „уласнікаў" — гаспадароў. Найперш заходзім на панадворак Тодара Маціевіча. На яго стадоле красуецца гняздо, аднак буслоў яшчэ не відаць.

— Скажыце, дзе вашы буслы?

Дзядзька збіраўся ў поле сеяць. Ён палажыў на воз мяшок са збожжам і стаў расказваць:

— Буслы гнездавалі тры гады на нашай хаце, але я хацеў, каб перанесці іх на гумно. Аднак ім не спадабалася гэтае другое месца і перасталі сяліцца.

— Шкада іх?

— Вядома, шкада. Але на хаце яны рабілі шкоду, у даху была дзірка і працякала з гнязда.

— Перашкаджаў вам іх клёкат?

— Наадварот, прыемна было яго слухаць, было вядома, што ўжо настала вясна.

— Кажуць, калі на панадворку буслы, дык у хаце многа дзяцей.

— Мы ж ужо застарыя, — смяецца пенсіянер Маціевіч.

Далей мы падаліся ў той бок сяла, дзе праходзіць дарога з Кляшчэляў у Гайнаўку. На электрычным стаўбе сядзелі два буслы. З хаты насупраць гнязда прывітала нас Надзея Яканюк:

— Буслы тут больш за трыццаць гадоў. Спачатку яны хацелі пасяліцца на нашай клуні, але нешта не атрымалася. Прылятаюць кожны год. За ўсе гэтыя гады толькі раз не вярнуліся з выраю. Аднойчы прыляцелі тры буслы, пабіліся і аднаго забілі.

— Ці ведаеце звязаныя з бусламі павер'і?

— Я чула, — кажа спадарыня Яканюк, — калі бусел выпадзе з гнязда, дык чакае нас неўраджайны год. Але гэта не збылося. Тры гады таму бусляня выпала з гнязда. Мы занеслі да суседкі, але яно там здохла.

— Ці вы зжыліся з бусламі?

— Нам буслы не перашкаджаюць. Яшчэ і мілей, калі пачуеш іх клёкат. Унукі кажуць: „Бусел кле-кле-кле"! За ўсе гады толькі раз не было малых буслянат, бо буслы прыляцелі ўжо запозна.

Трэцяе гняздо ў цэнтры мясцовасці якраз на пляцы, на якім Гмінная ўправа і асяродак здароўя. Даведацца пра буслоў мы выправілі нашых жулікаватых хлопцаў, якія замест распытаць, пайшлі ў краму за „чыпсамі".

— У гміне ніхто не ведаў, — адказалі яны без пераканання.

З буслянкі пачуўся вясёлы клёкат. Нам прыгадалася легенда, у якой Бог замяніў несумленнага селяніна ў бусла.

Моніка Троц, Лешак, Хрыстафор пад кіраўніцтвам Ганны Кандрацюк

Апошнія буслы

Зелянелі ўжо палеткі,
вішні ўсе былі ў кветках,
як аднойчы майскім ранкам
на старэнькую буслянку
буслы нашы прыляцелі,
стомлена, у пары, селі,
і пакуль заклекаталі,
на падворак пазіралі,
на наш дом, на пуню, стог,
на платы і на парог,
дзе стаяла баба Маня,
што кароў даіць йшла з рання.
— Чом вы, буслікі, так позна? —
запытала баба слёзна.
Чуе бабка, як клякочуць,
бы сказаць ёй праўду хочуць:
„Вось, у роднае старонне
прыляцелася нам сёння,
бо мы несліся са страхам
над зямлёй, дзе адны жахі,
дзе вайна, дзе дым пажару —
у краіну сваіх мараў.
Вось, мы ўжо у роднай хаце.
Можаце нам пажадаці,
каб паспелі нашых дзетак
вывесці за гэта лета.
Звіце дзеда, унукаў клічце!
Шчасця ўсім нам, птахам, зычце!"

Міра Лукша

Перніковая хатка

За вёскай стаіць Перніковая хатка. Гэта зусім як у казцы. У Перніковай хатцы жыве Баба-Яга, зусім іншая, чым у Хатцы на курынай ножцы. Дзеці ў вёсцы ведаюць казкі і тое, на што здольныя Бабы-Ягі, якія могуць звабіць у хатку Яся з Маргарыткай, Іванку-дурненькага ці блуднага рыцара, што змагаецца ў свеце за справядлівасць, і чым гэта можа кончыцца. Казка найчасцей канчаецца добра, толькі не Бабе-Язе ці ненасытнаму Ваўку. Бо Баба-Яга — злосная, таямнічая чараўніца, з якой лепш не ўваходзіць у зваду. І хіба не дарма бабулю Ядвігу, што жыве за вёскай, называюць Бабай-Ягай. Можа, ад імя, можа, ад таго, што нос у яе кручком звісае над запалым ротам (старасць, ведаеце, нікому красы ж не дадае, і нават найпрыгажэйшы звяне, як той асенні ліст...). А, можа, таму, што ўмее „шаптаць" — выгнаць „вецер" і „ружу", знішчыць нагавор ды дзеянне злога вока... Можа, праўда гэта, а, можа, мана ці глупства, але ўсе, здаецца, крыху пабойваюцца Бабы-Ягі, аднак, калі прыйдзе бяда, бягуць да яе хутчэй чым да доктара. А дзецям, можа, было б і цікава да яе зайсці, пабачыць, чым яна займаецца, але не па дарозе ім туды, да хаткі наводшыбе. А баба Ядвіга рэдка заходзіць у вёску. Дома ёсць у яе тэлевізар, з таго часу, як электрыфікавалі вёску, дык бабуля Ядвіга ўсё ведае, што тварыцца ў свеце. Тэлевізар, кажа, найлепшы таварыш і пляткар. А з дзецьмі ахвоту мае пагутарыць. І „звабіла" Яся з Маргарыткай у сваю Перніковую хатку. Прыйшлі дзеці па зёлкі на кашаль для цёці Каці, школьнае прыбіральшчыцы. Выбраліся ў Перніковую хатку пасля школы.

Доўга не выходзілі. А чаго і выбірацца? Столькі цікавага ў Бабы-Ягі! І пра ўсё раскажа: пра зёлкі, што сохнуць пад бэлькамі, якая зёлка ад якое нямогласці, пра каменьчыкі, які якую хваробу выцягвае з чалавека, калі прыкласці да балючага месца... І кнігі ў Бабы-Ягі цікавыя, набухлыя ад старасці і ведаў, а і звычайныя кніжкі ёсць, і газеты старыя, яшчэ і з мінулага стагоддзя... Не брала з іх паперы Баба-Яга на распалку ў печы, шкадавала, і цяпер амаль усё XX стагоддзе ў яе — як было, на старонках, на здымках...

Амаль на прыцемках прыбеглі ў вёску Ясь з Маргарыткай. Мама не турбавалася — бабка Ядвіга, як сучасная Баба-Яга, пазваніла ёй дадому.

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка № 19

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 15: Зубрыла, брыкун, прырода, зора, рыса, тур. Плот, зубр, брыз, Рыгор, цыкорыя, луда, цана, Ас.

Узнагароды — касеты з беларускімі казкамі і песнямі — выйгралі: **Эля Шарэйка, Эля Анджаўеская, Марцін Стоцкі** з Дубін, **Марта Каліноўская, Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!

Дэкламатары з Беластока

Дэкламатары з Орлі

„Роднае слова” ў Нараўцы

26 красавіка 2004 г.
Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Юліяна Дораш — Бельск

Пра дэкламатарскі конкурс „Роднае слова” можна сказаць адно — з году ў год прыбывае нам новых дэкламатараў.

Нараўчанскі дом культуры, які ўпадабалі сабе арганізатары (Беларускае грамадска-культурнае таварыства) не ў змозе памясціць усіх удзельнікаў. У гэты раз было 120 асоб. З другога боку — адной статыстыкі мала, каб быць задаволеным.

Калі гляджу на „Роднае слова” з перспектывы пяці апошніх гадоў, дык бачу тых самых удзельнікаў, тыя ж вершы, тую ж камісію, тыя ж узнагароды. Ёсць нават дзівосныя здарэнні. Адзін з выканаўцаў ужо трэці год запар дэкламаваў, дарэчы — без поспеху, адзін і той жа твор.

Праўда, і гэты раз можна было б дагледзецца новых з’яў, напрыклад, прыток рэлігійнай паэзіі. Аднак тут заслуга арганізатараў „Першага дэкламатарскага конкурсу хрысціянскай паэзіі”. Такім чынам удзельнікі выступілі з адным творам у двух конкурсах і два разы заваявалі прэстыжныя месцы.

У гэты раз галоўныя прызы заваявала бельская „тройка”. Удзельнікаў ацэньвалі: Тамара Русачык (старшыня камісіі), Вольга Сянкевіч і Яніна Плютовіч (члены).

ЗОРКА

Аня Дудзіч — Нарва

Магдаліна Бабік — Беласток

Міхась Хмялеўскі — Беласток

Матэвуш Севастыянік — Беласток

Юстына Апольская — Супрасль

Школьніцтва

Хаця да канца XIX стагоддзя Орля карысталася гарадскім правам, аднак тады народ не меў доступу да асветных устаноў. Арганізаванае навучанне ў Арлянскай гміне пачало развівацца ў тадышніх васьмідзесятых гадах. У кастрычніку 1884 года ў Арлянскім прыходзе былі адкрыты тры г.зв. „подвижные" школы, якія сялянскім дзеткам давалі шанс знаёміцца з граматай. Гэтыя аднакласныя асветныя ўстановы без сталых памяшканняў існавалі ў пяці вёсках: Шарнях, Рудутах, Крывятычах, Тапчыкалах і Пашкоўшчыне.

У 1901 годзе ў Арлянскім прыходзе працуе ўжо адно народнае вучылішча, у якім вучыцца 171 вучань, і сем рухомых школ (146 вучняў). Як гаварылі мне калісь старэйшыя людзі, навучанне па вёсках адбывалася ў хатах, з якіх выводзіліся вучні — па некалькі дзён у адной хаце. Пераважна вучылі хлопцаў, дзявочае навучанне абмяжоўваючы адно да навукі чытання. У Орлі школа размяшчалася ў некалькіх невялікіх драўляных будынках.

У міжваенны перыяд арлянская школа была пераведзена ў вялікія драўляныя будынкі, якія раней займаў шпіталь (арлянскі шпіталь быў пабудаваны пры цары для ваенных патрэб яшчэ ў той час, калі нават у Бельску такога не было). Сямікласная агульная школа ахоплівала сваім абсягам чатырохкласныя школы ў Шчытах, Махнатым ды Чыжах і вучылася ў ёй 450 вучняў польскай, яўрэйскай і беларускай нацыянальнасцей.

У верасні 1939 года, пасля недаўгачаснай нямецкай акупацыі, у Орлю завітала савецкае войска. Савецкія ўлады зарганізавалі тут 16-аддзелавую школу з беларускай мовай навучання, якую наведвала 640 вучняў; працавала ў ёй 18 настаўнікаў. Немцы, якія насталі тут у чэрвені 1941 года, дазволілі на існаванне 4-класнай школы з беларускай мовай навучання. Пры саветах вучняў вярталі на клас ніжэй, а пры немцах не навучалі ўсіх прадметаў.

Пасля вызвалення летам 1944 года, навучанне ў арлянскай школе пачалося з верасня. Зарганізаваны былі чатыры аддзелы, лік якіх да 1947 года вырас да сямі, а ў 1967 — да васьмі. Навучанне адбывалася па-беларуску; дзецям каталіцкага веравызнання быў адведзены аддзельны клас, дзе навучанне адбывалася па-польску. У 1950-60 гг. лік вучняў хістаецца ў межах 249-287, з якіх па 23-30 паўтаралі класы; працавала тады 5-8 настаўнікаў. З 1965 года мяняецца мова навучання: вучоба адбываецца, у залежнасці ад класа, па-польску, па-беларуску або паралельна на абедзвюх мовах.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Неіснуючы ўжо адзін з будынкаў арлянскай школы

Пасля другой сусветнай вайны для школы ў Орлі быў пабудаваны вялікі драўляны будынак (які Радай гміны ў 2001 годзе быў ахвяраваны пад касцёл), а частку пасляшпітальных будынкаў прыстасавана для патрэб дзіцячага садка, бібліятэкі, дома культуры, клуба і гміннай управы; апошнія будынкі былі ў 1986 годзе прададзены і знесены, паколькі быў патрэбны пляц пад будаўніцтва новай школы (дзіцячы садок быў тады закрыты і да сёння не адноўлены). Ад пасляваенных да 60-х гадоў побач пачатковай школы працавала яшчэ школа сельскагаспадарчай падрыхтоўкі.

У 1973 годзе наступіла рэарганізацыя арлянскай школы. Узнікла Зборная гмінная школа, якой падлягалі філіяльныя пункты ў Рудутах, Шчытах і Вульцы-Выганоўскай ды школы ў Пашкоўшчыне, Малінніках і Крывой. Школу ў Крывой у 1978 годзе замянілі ў філіяльны пункт, пасля года вярнулі ў ранг школы і некалькі гадоў пазней, ужо ў межах Бельскай гміны, з прычыны малалікасці вучняў, закрылі. У той час у Орлі 260-270 дзяцей, якіх навучалі 18-20 настаўнікаў, вучыліся ў пяці старэючых будынках, пераходзячы ў час перапынкаў з адных у ін-

У вайну парадніліся

Расказвае 79-гадовы Аляксандр РАЧКЕВІЧ з Дабрывады, што ў Кляшчэлеўскай гміне.

З прыходам саветаў частка афіцэраў з ваеннага гарадка ў Кузаве закватаравалася ў Дабрывадзе. У нашым доме пасяліўся лейтэнант Бісурын — чалавек скрыты ды маўклівы. Пра сябе і сям'ю не расказваў. Меў схільнасць да гарэлкі — выпіваў амаль штодзень. Пасыльным я ў яго стаў. „Прынясі, пацан", — гаварыў, усунуўшы мне грошы ў руку і я бег да Антошкі. Дзядзька, які жыў непадалёк, працаваў у Чаромсе кандуктарам. У Брэст ездзіў і адтуль прывозіў гарэлку ды патаемна яе прадаваў. Аб звычках афіцэра даведалася НКВД. У сельсавеце, куды Бісурына выклікалі, старшынёю працавала цётка Марыя Рачкевіч. Яна аб даносе сказала бацьку. Калі пра гэта даведаўся лейтэнант, дык ціхачом загадаў мне: „Як будуць пытаць, ці гарэлку прыносіў, не прызнавайся". Два разы мяне выклікалі. Не прызнаўся і справа заціхла.

Аднойчы, а было гэта ў нядзелю, пачуўся гул самалётаў з боку Чаромхі. Мы выйшлі на панадворак. „Это манёвры", — абыякава кінуў Бісурын. Пачуліся ўзрывы. Адзін, другі... Афіцэр кінуўся дахаты. Выскачыў, быццам апараны, апрануўшы уніформу „на хаду" і прышпільваючы кабуру з пісталетам. Ужо ўсур'ёз крыкнуў: „Война, ребята, война". Без развітання падаўся ў Чаромху і ў Дабрываду ўжо не вярнуўся. Сем'і рускіх афіцэраў і чыноўнікаў таксама паўцякалі, адно дзве жанчыны засталіся. Адна жыла на казарме пры чыгуначнай лініі Чаромха — Гайнаўка. Муж яе, Чэрнышаў, чыгуначным майстрам працаваў. Другая — Зінаіда Дзмітраўна Гранкіна — кватаравалася ў Мікіты Еўдасюка. Муж яе на граніцы ў Сямятычах служыў. Гранкіна была цяжарнай, неўзабаве нарадзіла сына. Яна з маёй жонкай сябравала.

— Папрасі, Аня, брата (Інакенція Сідарука — заўвага У. С.) няхай хросным бацькам майму сыну будзе. А ты кумой. Разам ахрысціце.

Жонка адмовілася, паколькі дагэтуль у вёсцы брат з сястрою не кумавалі. Канчаткова Даніла Еўдасюк згадзіўся стаць кумом. Пасля хрысцін Зінаіда перайшла да нас на кватэру. У час нямецкай акупацыі разам мы жылі. Хацелі Зінаіду ў Нямеччыну вывезці, але цесць, Пятро Сідарук, пахадайнічаў у кляшчэлеўскай жандармерыі і пакінулі яе, як работніка на гаспадарцы. Як рускія немцаў пагналі ў 1944 годзе, дык Зінаіда Дзмітраўна пры нашай дапамозе да бацькоў пад Растоў выехала. Нейкі час утрымоўвалі пісьмовы кантакт. З таго часу, як паслалі метрыку сына, дык сувязь парвалася.

З надыходам фронту ў 1944 годзе, немцы грабілі што далося. У асноўным коней і фурманкі. Мы схаваліся на ўрочышчы „Барташоўка". Чакалі пакуль усё сціхне. Аднойчы завітаў Павел Блашук і кажа: „Немцы ўцяклі". Мы ў вёску пераехалі. Наступнай раніцы рускія прыйшлі. Пачаткова пяхота, затым артылерыя. Лейтэнант-артылерыст у Чэрнышавай „зямлячку" пазнаў. Неўзабаве сталі „закаханай парай", сустракаліся штодзень. Аднойчы, калі салдаты адпачывалі, а лейтэнант-артылерыст гуляў з Чэрнышавай, з боку Чаромхі пачуліся ўзрывы. Немцы разбуралі станцыю ды вадакачку. Пад наш дом заехаў аўтамабіль (Чэрнышава з казармы перасялілася да нас на кватэру). Афіцэра арыштавалі. Прыезджыя загадалі артылерыстам страляць па Чаромсе. Калі „зайгралі" кацюшы, дык немцы не стрымалі напору і рушылі шашою ў напрамку Сямятычаў. Пасля гаварылі, што рускія разбілі іх за Нурцом.

Пасля вайны мы не ведалі, што сталася з Гранкінай і яе сынам. Пасля „перастройкі" атрымалі ліст. Жанчына пісала, што працавала ў вайсковай часці і не дазвалялася ёй весці перапіску з палякамі. Прапанавала сустрэчу. Паслала запрашэнне. Паехаў я ў Маскву. Было гэта ў Дзень перамогі 9 мая. Гранкіна паўторна выйшла замуж. Нарадзіла дачушку Таню. Зараз яна дарослая. Нарадзіла блізнюкоў. А сын Жэнік, які ў час вайны нарадзіўся ў Дабрывадзе, дачакаўся двух сыноў. Прыяцелі называюць яго палякам. Ад трох гадоў езджу ў Маскву на Дзень перамогі да сваёй знаёмай, якую сястрой магу называць, бо ў сапраўднасці вайна нас парадніла.

Запісаў Уладзімір Сідарук

Сляды другой сусветнай вайны ў Бялках

Вёска Бялкі распаложана ў паўночна-заходняй частцы Нарваўскай гміны. Мяжуе з Заблудаўскай і Міхалоўскай гмінамі. Цяпер яна ціхая і заняпалая, як многія вёскі на Беласточчыне.

Падчас нямецкай акупацыі на прымусовыя работы была забрана 61 асоба. Некалькі асоб працавалі ў Беластоку і Старасельцах, а астатнія былі вывезены ва Усходнюю Прусію і Нямеччыну. У ліку тых 61 асоб было пяць сем'яў і двух „васточнікаў" — байцоў Чырвонай Арміі, якія не паспелі ўцячы на Усход. Не засталіся ў жывых восем асоб, у тым ліку адна жанчына. Людзі ведалі, што адна магіла знаходзіцца ў Беластоку і пасля вызвалення перапахавалі астанкі на могілкі ў Трасцянцы, бо тут наш прыход. З упамянутых 61 асоб, пяць мужчын прызвалі ў Чырвоную Армію. Яны пасля вайны вярнуліся на бацькаўшчыну, хоць усе былі паранены, хто цяжэй, а хто лягчэй. Многа з тых людзей адышло ў вечны спачын, няхай ім зямля будзе пухам. Некаторыя пераехалі на пастаяннае жыхарства ў Савецкі Саюз, як рэпатрыянты, а некаторыя спакойна дажываюць свой век пры дзецях або ўнуках. Жудасны тады быў час, бо кожнага чалавека, у кожнай хвіліне чакала смерць. Не так ступіў перад немцам, ці не пакланіўся яму — мог быць расстраляны. Але яксьці вытрывалі і перажылі тое ліхалецце.

Мікалай Лук'янюк

ў Арлянскай гміне

шыя. З-за гэтай складанасці Рада гміны ў 1984 годзе прымае пастанову аб пабудове новага школьнага будынка; прадбачвалася, што ў час канікул новы аб'ект, распаложаны ў зоне „зялёных лёгкіх Польшчы", будзе базай лячэбнага адпачынку для хворых дзяцей з усёй краіны.

Навучальную і кухонную частку новай арлянскай школы, якая будавалася сем гадоў за сродкі з дзяржбюджэту пры фінансавай падтрымцы мясцовай Гміннай управы, здалі ў карыстанне 17 снежня 1992 года, а ў лютым 1995 года — рэшту аб'екта і гімнастычную залу. Ва ўрачыстым адкрыцці школы ўдзельнічалі таксама госці з Мінска і Гродна. Прысутны на мерапрыемстве працаўнік беларускага міністэрства культуры Аляксандр Сасновіч, які пасля два гады працаваў у новай школе музычным інструктарам, прыдбаў ёй піяніна „Беларусь", цымбалы і акардэоны, з якіх, пасля прывозу на Беласточчыну, толькі частка апынулася ў Орлі, а і тая сёння бяздзейнічае.

У 1999 годзе ў сувязі з асветнай рэформай і ў выніку дамовы дзвюх гмін — Дубіцкай і Арлянскай — у Орлі была створана гімназія, якая пратрывала два гады. Годам пазней школа ў Малінніках ліквідавалася, а вучні трапілі ў Орлю. 1 верасня 2001 Рада гміны прыняла пастанову аб стварэнні Комплексу агульнаадукацыйных школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Колішняя школа ў Шчытах

Сёння ў агромным будынку арлянскай школы, разлічаным на 500 вучняў, займаецца 272 дзяцей, у тым ліку 74 гімназістаў; 135 асоб (54%) вывучае беларускую мову.

* * *

З убываннем ліку дзяцей закрываліся вясковыя школы. Пабудаваныя калісь пры вялікім укладзе грамадскай працы будынкі стаяць апусцелыя, часта панішчаныя, з'яўляючыся доказам вандалізму і абыякавасці да супольнага дабра. Арлянская гміна багатая пустымі пасляшкольнымі будынкамі.

Шчыты-Дзенцялова. Тут школа была закрыта 26 гадоў таму, але мураваны з чырвонай цэглы будынак трымаецца моцна. Ад вандалізму і халатнасці гмінных улад найбольш пацярпела драўляная сталярка. Як даведаўся я ва Управе гміны, на гэты год запланаваны рамонт часткі памяшканняў з прызначэннем іх на вясковую святліцу.

Вулька-Выганоўская. Вялізны салідны драўляны будынак стаіць пусты і руйнуецца. Асабліва, з-за выбітых шыб, нішчэе верхні паверх. Пару гадоў таму вокны забілі дошкамі, а ў частцы ніжняга паверха правялі рамонт з мэтай прызначэння яго на вясковую святліцу.

Пашкоўшчына. Вялікі драўляны будынак, у верхняй частцы якога пасля закрыцця школы праз нейкі час жыло маладое сужонства. Калі стала моднай музыка дыска-пола, будынак арандаваў прыватнік. Калі зменшылася зацікаўленне танцамі, у пасляшкольным будынку некалькі разоў дзялкі адкрывалі бар, але з-за адсутнасці кліентаў кідалі гэты бізнес. Гміна прабавала прадаць будынак, але нічога з гэтага не атрымалася і будынак пустуе.

Маліннікі. Вялікі двухпавярховы мураваны будынак пакуль стаіць пусты, але ёсць намер стварыць у ім дом сацыяльнай дапамогі; гміна на гэты конт мела хадайнічаць за сродкамі з фонду SAPARD. Жыхары Маліннік заангажаваліся ў гэтую справу, калядуючы па вёсках. Сабралі звыш чатырох тысяч злотаў і маюць намер калядаваць у будучыні. Як сказала мне солтыс Маліннік, а заадно і гмінная радная, Ніна Іванюк, людзі вельмі прыхільна ставяцца да гэтай задумы.

Міхал Мінцэвіч

Пра адукацыю

Будынак колішняй школы ў Дубічах-Царкоўных быў узведзены яшчэ ў царскі час. Школа гэтая служыла мясцовым дзецям шмат-шмат гадоў, людзі дбалі пра захаванне яе ў добрым стане і неўзабаве гістарычны будынак прыме ролю музея нашай беларускай культуры і спадчыны.

Пры цары выпускнікі нават двухгадовага народнага вучылішча ўмелі беспамылкова пісаць па-руску ды лёгка цытаваць з памяці вершы рускіх класікаў, напрыклад, „Барадзіно" Лермантава.

Пры санацыі ў дубіцкай школе вучылі двое настаўнікаў: Заблоцкі і Шчэпанская, якія карысталіся вялікай пашанай большасці вяскоўцаў. Але ў вёсцы былі і камуністы, якія не цярпелі эліту, толькі стараліся ёй шкодзіць. Былі спробы дакучаць і бацюшку Мірану Сянкевічу, але ён быў вельмі дужы і не аднаго з нашых вясковых „левых герояў" ён так „хрысціў" дубінкай, што аж рэха расходзілася. Так было з тройкай маладых тафілаўскіх кавалераў, якія вечарам каля царквы пап'янаму праспявалі „салёную" песню ў адрас бацюшкі. Калі заўвага свяшчэнніка, каб супакоіліся, яшчэ іх падбадзёрыла і яны галасней загарланілі, тады бацюшка не сцярпеў і аддубасіў кожнага з іх. А на другі дзень яны без абеду мусілі грузіць гной і вывозіць у поле; гэта быў добры „спорт", пасля якога чалавек карысна змяняўся.

Польская санацыйная школа была такая ж бедная, як і сама Польшча. У той час мала якому вучню бацькі маглі купіць падручнікі, сшыткі ці крамную сумку. Падручнікамі трэба было дзяліцца, а сумкі былі самаробныя. У вясковых школах было па чатыры класы, у якія трэба было хадзіць на працягу сямі гадоў. Хто ў нас хацеў кончыць сем класаў пачатковай школы, вымушаны быў даязджаць у Кляшчэлі або Орлю. У санацыю толькі адзін Сцяпан Гаўрылюк здабыў такую адукацыю, даязджаючы ў Кляшчэлі роварам.

Мікалай Панфілюк

Мы выжылі

Размова з палкоўнікам Аляксандрам УРБАНОЎСКІМ, старшынёй Ваяводскай управы Звязу былых вайскоўцаў у Беластоку.

— Мінае 59 гадоў ад заканчэння ваенных дзеянняў у Еўропе. Дзе Вы былі ў той час?

— Над Эльбай, у складзе 1 арміі Польскага Войска, якая там зышлася з амерыканскай арміяй.

— Што адчувалі Вы і Вашы баявыя таварышы на вестку аб заканчэнні вайны?

— Што было думаць — мы выжылі, але згадвалі пра тых шматлікіх сяброў, што асталіся за намі.

— А як пачалася, калі так можна назваць, Ваша ваенная прыгода?

— 10 лютага 1940 года мяне дэпартавалі з Ломжы на ўсход; за што — дагэтуль не ведаю. Апынуўся я на лесапавале ў Архангельскай вобласці. Нашы савецкія наглядчыкі, дзесятнікі, адносіліся да нас у прынцыпе карэктна. Я магу мець засцярогі да некаторых з іх, але не да агулу расіян — яны дзяліліся з намі, як гэта гаворыцца, апошнім кавалкам хлеба. Пасля дамовы Сікорскі-Майскі палякаў перасталі лічыць ворагамі і мяне перамясцілі ў мясцовасць Кафан на паўднёвым усходзе Арменіі. Тыя, што не ўспелі ў армію Андэрса, у іх ліку і я, падаваліся ў армію Берлінга, арганізаваную Вандай Васілеўскай. Везлі нас вельмі доўга, дачэплівалі вагоны... І калі мы на станцыі Дзівова ўбачылі мачту з бела-чырвоным сцягам, многім пакаціліся слёзы з вачэй. У маі 1943 года я быў прызначаны ў разведачную роту, прайшоў бой пад Леніна, а пасля накіравалі мяне ў афіцэрскую школу ў Разані, якую я закончыў у гадавіну дэпартацыі — 10 лютага 1944 года.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

— Які адсотак фарміраванага войска складалі ўраджэнцы Крэсаў, а ў іх ліку — Беласточчыны?

— Мы ўзаемна распытвалі, хто адкуль. Спачатку ўсе салдаты былі з ліку дэпартаваных, з цэлых Крэсаў — з Падолля, Валыні. І з Беласточчыны было шмат, але якую частку яны складалі, сёння не магу прыгадаць. У іх ліку быў, напрыклад, Уладзіслаў Высоцкі з Бельска-Падляшскага. Пазней, калі фарміравалася 3 дывізія, у яе склад мабілізавалі палякаў з далучаных да Рэйха польскіх зямель, якіх немцы прызвалі ў Вермахт, і яны пасля Сталінградскай бітвы апынуліся з арміяй фон Паўлюса ў савецкім палоне. І ўсе радаваліся — і яны, і мы. Пасля вайны я спатыкаўся ў Сілезіі са шматлікімі з іх.

— Некаторыя польскія эміграцыйныя кругі папракаюць заходніх альянтаў за ўзбраенне Сталіна і аддачу яму паловы Еўропы. Ці Вы падзяляеце такі пункт гледжання?

— Не, я так не мяркую.

— Ці можна сабе ўявіць заканчэнне вайны сіламі толькі заходніх альянтаў, без супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам, ды кошты і выследкі такога варыянту?

— Лічу такі варыянт немагчымым. Тады самім альянтам зямля пад нагамі гарэла — яны самі вайны з Германіяй не выйгралі б.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Аляксандр Вярбіцкі

Беларусы Томска таксама прапагандуюць нацыянальную культуру...

belorus.tomsk.ru

Аб тым, што беларусы раскіданы па цэлым свеце, ведаюць усе. Сёння прапаную пазнаёміцца з арганізацыяй, што дзейнічае ў далёкім сібірскім Томску і яго ваколіцах. Зразумела, адбудзецца гэта праз адпаведны сайт у Інтэрнэце.

Калі набярэм адрас belorus.tomsk.ru, то з'явіцца прывабнае стылізаванае выяўленне Пагоні, акаймлёнае надпісам па-расійску „Томская региональная общественная организация Белорусской культуры «Белые росы» (Томская рэгіянальная грамадская арганізацыя Беларускай культуры «Белыя росы»). Усё гэтае выяўленне размешчана на шэрым фоне, дзе таксама знаходзяцца два сцягі — расійскі трыкалёр і беларускі бел-чырвона-белы, якія адначасова спасылкамі на адпаведныя моўныя варыянты сайта.

Беларускамоўны варыянт „Навінаў" — небагаты. Паведамляецца там толькі аб тым, што сайт стварыўся 15 жніўня мінулага года і распрацоўшчыкі рады вас вітаць. Расійскамоўная версія „Навінаў" больш адпавядае сваёй назве, хаця і тут апошняе абнаўленне адбылося аж напрыканцы зімы.

Варта помніць, што для нацыянальна-культурніцкіх сайтаў аператыўнае абнаўленне апошніх паведамленняў наўрад ці з'яўляецца першачарговай мэтай. Значна цікавей, для знаёмства з такой арганізацыяй, даведацца аб яе гісторыі, неардынарных здабытках, увогуле культурным жыцці. Дзеля гэтага раю націснуць на рубрыку „Пра нас", дзе томскія беларусы распавядаюць аб сваёй арганізацыі. Паводле іх, на тэрыторыі Томскай вобласці Расіі пражывае больш за 10 тысяч беларусаў. Усе яны — нашчадкі колішніх перасяленцаў, паток якіх то знікаў, то зноў аднаўляўся цягам апошніх чатырох стагоддзяў. У выніку перасялення, якое падаецца нечым падобным на засяленне еўрапейцамі Амерыкі, у Сібіры з'явіліся цэлыя беларускія вёскі. Пра гэта распавядае рубрыка „Гісторыя", што ідзе наступнай.

Далей — цікавей. Аказваецца, беларусы ў Томску і ваколіцах не толькі пасіўна зберагаюць памяць аб сваіх каранях, але і прапагандуюць нацыянальную культуру праз уласны ансамбль „Крылы", аб чым гаворыцца ў адпаведнай рубрыцы з левага боку старонкі.

Ёсць у гэтых сібірскіх беларусаў і свая віртуальная бібліятэка — досыць цікавая для мовазнаўцаў, бо з яе можна даведацца аб асаблівасцях, якія набыла беларуская мова цягам стагоддзяў у гэтым кутку неабсяжнай Сібіры.

Вартай увагі падаецца рубрыка „Кухня", дзе размешчаны каля дзесятка розных рэцэптаў прыгатавання нацыянальных беларускіх страў. Нягледзячы на тое, што мовай напісання ёсць беларуска-расійская „трасянка", каштоўнасць зместу цяжка перабольшыць, бо гаворка ідзе аб „хлебе штодзённым".

Не забыліся беларускія камп'ютэршчыкі Томска і аб іншых карысных, на іх думку, Інтэрнэт-рэсурсах, разнастайным чынам звязаных з Беларуссю. Адсюль можна выйсці не толькі на сайты грамадскіх арганізацый, такіх як Беларускі народны фронт, ці Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына", але і на афіцыйны сайт Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расіі. Гэта лёгка зрабіць, зайшоўшы на рубрыку „Спасылкі".

Неабходна адзначыць і тое, што старонкі томскага сайта змяшчаюць не толькі друкаваную інфармацыю, але і цікавыя фотаздымкі, якія дазваляюць стварыць у вандроўніка па Інтэрнэце больш змястоўнае ўяўленне аб дзейнасці тамтэйшага асяродка беларускай культуры.

Уладзімір Лапцэвіч

Другі сход беларускай інтэлігенцыі

Беларусь, беларусы...

25 красавіка ў Мінску адбыўся Другі сход беларускай інтэлігенцыі. Яго дэлегатамі сталі 176 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны. Прайшоў ён у Доме літаратара. Вялі сход Уладзімір Колас, Аляксей Марачкін і Вольга Іпатава. Нягледзячы на запалохванні з боку ўлад беларуская інтэлігенцыя не пабаялася выявіць сваю грамадзянскую пазіцыю. У адмысловай рэзалюцыі было падкрэслена, што прайшоўшы год пасля першага форуму „адзначаны далейшым заглыбленнем краіны ў сістэму таталітарнай улады". Сход выказаў абурэнне з прычыны шматлікіх праяў нішчэння беларушчыны і заклікаў да кансалідацыі нацыянальна-дэмакратычных сіл. Па прапанове Яўгена Лугіна быў закладзены пачатак новага агульнабеларускага руху — Нацыянальнага камітэта „За справядлівыя выбары". Акрамя гэтага падрыхтавана стварэнне новай грамадскай арганізацыі — Рады беларускай інтэлігенцыі.

Прыналежнасць да нацыянальнай інтэлігенцыі вызначаецца разуменнем яе місіі і свайго самаахвярнага ўдзелу ў ажыццяўленні мэт і задач нацыі. Тут галоўным элементам спрэчак стала моўнае пытанне. Зразумела, што для таго, каб называцца беларускім інтэлігентам мала толькі карыстацца беларускай мовай. Але каб не быць інтэлігентным чалавекам, няведання роднай мовы дастаткова. Сапраўднаму беларускаму інтэлігенту не толькі трэба ўжываць родную мову ў паўсядзённым жыцці. Яму трэба яшчэ і шырыць яе, і ствараць на ёй. І гэта тычыцца не толькі паэтаў, пісьменнікаў ці гісторыкаў. Нават прадстаўнікам дакладных навук трэба карыстацца толькі роднай мовай. Інакш да нацыянальнай інтэлігенцыі іх не залічыш, якімі б вялікімі спецыялістамі ў сваёй навуковай галіне яны не былі.

Светагляд інтэлігенцыі не можа звужацца толькі да сваіх прафесійных абавязкаў. На плячах элітнага класа нацыі, які ў часы камунізму пагардліва называлі „праслойкай", ляжыць вялікая місія. Перш усяго, гэта захаванне традыцый народа, а таксама вызначэнне яго маральных і этычных арыенціраў. На жаль, гэты цяжкі, але вельмі пачэсны абавязак не толькі беларуская інтэлігенцыя, але і іх замежныя калегі, выконваюць недастаткова. Не чуваць іх голасу па галоўных этычна-маральных пытаннях. Прыкладам, аднаполыя шлюбы ці парнаграфія, ад якой захліснуліся даступныя нават дзецям тэлеэкраны. А чалавек, які не рэагуе на такое разбурэнне маральных нормаў грамадства і не мае цвёрдай адназначнай пазіцыі на элементарныя патрабаванні этыкі, не можа лічыць сябе інтэлігентам. Бо для грамадства інтэлігенцыя мусіць быць арыенцірам першым чынам духоўнага жыцця. У адваротным выпадку яна так і застанецца „праслойкай".

З'езд беларускай інтэлігенцыі становіцца традыцыяй. Вельмі радуе тое, што гэтая традыцыя закладаецца ў Беларусі. І хоць умовы правядзення, мякка кажучы, не самыя спрыяльныя, знайшлося мноства людзей, якія адказнасць за лёс і будучыню беларускай эліты паставілі вышэй асабістых праблемаў. Рана ці позна на такіх з'ездах будуць вырашацца сама надзённыя пытанні. Да іх пастаноў будуць прыслухоўвацца і палітыкі, і ўлада, і ўсё грамадства. Голас інтэлігенцыі Беларусі павінен прагучаць. Калі памарыць, то гэта ў далёкай будучыні можа стаць пачаткам з'ездаў інтэлігентаў свету. Мы, беларусы, як закладальнікі гэтай традыцыі, зможам паказаць сваім калегам тое, што сусветная інтэлігенцыя не абстрактны элемент, а складаецца з прадстаўнікоў канкрэтных нацыянальных інтэлігенцый. Інакш быць не можа. Бо мы востра адчуваем гэта на сабе. Мы з гэтага пачалі, і толькі разуменне сваёй нацыянальнай тоеснасці і сваёй беларускай місіі дало нам штуршок у закладанні гэтай традыцыі. Ну, а пакуль што нам трэба самім прайсці гэты цяжкі шлях. Бо стварэнне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі — ключавое звяно беларускай нацыянальнай ідэі.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Занатоўкі кантрабандыста

Стрэльба ці малітва?

Як толькі я ўбачыў у машыне Мішы Гарэля жанчыну, адразу зразумеў — будуць праблемы.

— Міша, — кажу яму. — На якую халеру ты валачэш яе праз мяжу? З бабай у дарозе, як з бараной у лесе.

— Пацерпім, — тлумачыць Міша. — Нам у калгас нержавейку прыслалі на рамонт машын. Вельмі дарагі метал. А сусед мой — токар. Нарабіў з гэтага металу пяцьсот нажоў і паслаў жонку прадаваць. Па долару за нож. Грошы, кажа, невялікія, ды мы столькі ніколі не бачылі. Ну як я мог адмовіць. Такога металу ў наш калгас ніколі не давалі, баяліся што параскрадаюць. Ты ведаеш колькі сілы згубіў сусед, каб пераканаць кіраўніцтва, што ў нашым калгасе злодзеяў няма. Хай ягоныя намаганні аплацяцца. Заробяць свае пяцьсот долараў. А мне з суседзямі жыць трэба. Гэтая жанчына, Янька, кладаўшчыца. Ад яе шмат залежыць, што я вязу за мяжу.

Аргументы мяне пераканалі. Сапраўды Міша вазіў тое, што ў калгасе кепска ляжыць. Лемяхі да плугоў, шнур для цюкавання саломы, нават хімічную атруту ад палявых шкоднікаў. Кантрабандысты жартавалі, што яму трэба ўзначаліць партыю зялёных, таму што гэтая хімія не трапляе на нашы палеткі, экалагічная сітуацыя ў Беларусі значна палепшылася. Міша сам пасмейваўся, што возіць заходнім суседзям толькі атруту — хімію, цыгарэты і самагонку. Жартаваў, што беларускі ўрад мусіць яго ўзнагародзіць ордэнам за ачышчэнне Радзімы ад шкоднага.

Тое, што ўдасца перавезці такую колькасць нажоў праз мяжу я не сумняваўся. Міша так умеў хаваць рэчы, што часам здавалася можа ў сваёй маленькай машыне схаваць і танк. Але і прадчуванні, што будуць праблемы, мяне не падманулі. Пачаліся яны на рынку ў Цеханаве, калі да нас падышлі польскія паліцыянты. Тыя вельмі доўга вымяралі лінейкай нажы, узважвалі іх, ніяк не маглі пастанавіць, ці можна такімі рэчамі гандляваць. Пасля з'явіўся бандыт і запатрабаваў грошы. Я ляснуў яму лемехам па мордзе так, што ён валяўся пасярод рынку каля гадзіны, пакуль яго за ногі не адцягнулі некуды сябры. Затым зноў прыйшлі паліцыянты. Але даведаўшыся, што на рынку бандыты, хутка скочылі ў машыну і зніклі. Пасля зноў з'явіліся бандыты. Дачакаўшыся, калі мы скончым гандаль і паедзем, яны рушылі ўслед. Дарога цягнулася праз лес. Мы пачалі нервавацца.

— Жывымі не здамося, — пажартаваў заўсёды вясёлы Міша. І дарма. Пасля такіх слоў Янька завыла ваўчыцай, укленчыла ў машыне і пачала маліцца ўголас. Бандыты крычалі са сваёй машыны і патрабавалі каб мы спыніліся.

— Колькі ты, дурная, будзеш лямантаваць, — звярнуўся да жанчыны Міша. — Даставай хутчэй свае нажы. Трэба ж нам бараніцца.

Ды Янька яго ўжо не чула. Яна ўкленчыла на торбе з нажамі, канчаткова пазбавіўшы нас надзеі далезці хоць да нейкай зброі, і раўла як дурная. Ні то малілася за ўратаванне нашых жыццяў, ні то душаў.

— З гэтай дурной да толку не дойдзеш, — расчаравана кажа Міша. — Тут недалёка ў лесе жыве мой знаёмы. Можа там знойдзем паратунак.

Мы куляй заляцелі ў лясны хутар і спынілі машыну пад вялікім плотам. Бандыты спыніліся побач. Міша пераскочыў праз плот, але праз хвіліну пераляцеў назад з падзёртымі порткамі. За ім праз плот скочылі тры вялізныя сабакі. Што было рабіць. Я хапіў хімічную атруту і плюхнуў на морды сабак. Тыя заскавыталі як п'яныя кентаўры і паляцелі хто куды. Адзін нават ляснуўся з разгону ў машыну бандытаў. А мы, выбіўшы нагамі дзверы, заляцелі ў хату.

— Ратуйце, нас бандыты забіваюць, — зараўла гаспадарам Янька, грымнула на калені перад абразамі і зноў пачала маліцца.

— Дзед, хутчэй давай стрэльбу, ведаю, у цябе ёсць, — закрычаў Міша.

Але гаспадар паваліўся на калені побач з Янькай і маліўся, каб хоць хто — ці мы, ці бандыты з'ехалі з яго хаты. Гаспадыня стала шукаць стрэльбу, але не знаходзіла.

— Што ж вы ў лесе жывяце, а дзе стрэльба ляжыць не ведаеце, — занерваваўся я. — У такім бязлюддзі як на вайне.

Нарэшце гаспадыня знайшла патрэбнае. Праўда, быў толькі адзін патрон. Мы выйшлі з Мішам на двор. Ён дэманстратыўна падкінуў бутэльку, а я стрэліў па ёй. Патрапіў. Бандыты адразу ўцяклі. А мы за сталом, адкаркоўваючы чарговую бутэльку, доўга спрачаліся, што нас уратавала — малітва Янькі, ці стрэльба.

Назаўтра, прадаўшы тавар, па дарозе дахаты мы вырашылі заехаць на хутар, каб яшчэ раз падзякаваць гаспадарам. У хаце было ўсё як заўсёды. Толькі адна змена. На самым бачным месцы, у куце пад абразамі, стаяла стрэльба. Побач ляжаў пачак навюткіх патронаў.

Сымон Нальшанскі

ПАЎЛІНА РАІЦЬ

Нараджэнне дзіцяці гэта цуд і свята для бацькоў і цэлай сям'і. Часам, аднак, маладую маці, якая да гэтай пары вяла актыўнае жыццё, працавала, нараджэнне дзіцяці ставіць перад выбарам: працаваць ці астацца дома з дзіцём. Калі яна выбярэ другі варыянт, можа звярнуцца да свайго працадаўцы з просьбай даць ёй выхаваўчы водпуск. Варта памятаць, што ад 1 студзеня 2004 года змяніліся правілы атрымлівання выхаваўчага водпуску.

Калі жанчына працавала сама меней 6 месяцаў (лічыцца сума часу працы ва ўсіх працадаўцаў), мае яна права на трохгадовы выхаваўчы адпачынак. Увага: можна цэласць або частку водпуску перадаць бацьку (апекуну) дзіцяці. Не мусіць жанчына браць водпуск у цэласці, паколькі мае права падзяліць яго нават на чатыры часткі, калі выкарыстае апошнюю з іх да дня заканчэння 4 гадоў жыцця дзіцяці. Законна належацца яшчэ дадатковыя тры гады водпуску маці дзіцяці-інваліда, якія можна выкарыстаць да заканчэння 18 года ягонага жыцця.

Працадаўца абавязаны даць водпуск у адказ на пісьмовую заяву маці. Паводле новых правілаў заяву на атрыманне выхаваўчага водпуску трэба падаць дакладна на два тыдні да тэрміну водпуску. Да 1 студзеня 2004 года заяву можна было падаваць раней. Трэба памятаць, што ад дня падачы заявы да апошняга дня выхаваўчага водпуску маці ахоўваецца ад вызвалення з працы. Працадаўца можа ўвольніць толькі ў выпадку ліквідацыі або заняпаду фірмы, або калі існуюць падставы для дысцыплінарнага звальнення (напрыклад, калі па ўласнай прычыне маці страціць права на выконванне прафесіі). Трэба памятаць, што жанчына не ахоўваецца законам, калі заяву на атрыманне выхаваўчага водпуску падасць пасля атрымання ўвальнення з працы, нават калі гэта адбудзецца ў той самы дзень.

Што павінна стаяць у заяве? Трэба адзначыць дату пачатку і заканчэння водпуску, а калі частка выхаваўчага водпуску на данае дзіцё была ўжо выкарыстана, аб гэтым таксама трэба напісаць. Да заявы прыкладаецца заява бацькі дзіцяці, што ў вышэйпададзеным часе не будзе ён карыстацца водпускам. Такая заява непатрэбная, калі бацька, або апякун дзіцяці, пазбаўлены бацькоўскіх (апякунскіх) правоў, або яны ў яго абмежаваны ў судовым парадку, або калі нельга ўстанавіць месца яго пражывання. У такой сітуацыі да заявы прыкладаем дакументы, якія пацвярджаюць гэтыя факты, напр. судовае рашэнне аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў. Калі такія дакументы адсутнічаюць, жанчыне трэба зрабіць пісьмовую заяву. Новыя правы дазваляюць бацькам дзіцяці карыстацца выхаваўчым водпускам тры месяцы адначасова. Не страчваюцца тады з пулі цэлага водпуску шэсць месяцаў, а толькі тры, што не было магчымым перад навелізацыяй. У такой сітуацыі кожнае з бацькоў далучае да заявы заяву аб намеры выхаду ў водпуск.

Навелізацыя дае магчымасць забраць назад заяву на атрыманне выхаваўчага водпуску, аднак не пазней чым на сем дзён да яго пачатку. Зрабіць гэта трэба пісьмова.

Варта ведаць, калі працадаўца можа паўплываць на тэрмін пачатку выхаваўчага водпуску. Магчымае гэта, калі заява пададзена запозна, значыць, пазней чым два тыдні перад пазначанай у заяве датай пачатку водпуску. Працадаўца мае права даць водпуск толькі ў той дзень, калі сапраўды мінуць два тыдні ад падачы заявы. Не можа ён паслаць жанчыну на выхаваўчы водпуск, калі яна гэтага не жадае, бо такое рашэнне прымае яна сама.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Славістыка ў Любліне

30 месцаў падрыхтаваў Універсітэт імя М. Кюры-Складоўскай у Любліне для будучых славістаў. З 1 кастрычніка, у межах новага факультэта, студэнтам прапануюцца дзве спецыяльнасці: беларуска-руска-чэшскую і балгарска-руска-ўкраінскую (на выбар). Асноўны крытэрый адбору кандыдатаў — ацэнка па рускай мове на атэстаце сталасці або практычнае веданне мовы падчас кваліфікацыйнай размовы. Дадаткова ўвага будзе звяртацца на ацэнкі па іншай чым руская замежнай мове (асабліва беларускай і балгарскай), польскай мове (у другую чаргу) і па гісторыі (у трэцюю чаргу).

— Грунтоўная філалагічная падрыхтоўка, а таксама веданне трох усходнеславянскіх моў дазволяць нашым абітурыентам працаваць у якасці настаўніка, перакладчыка ці экскурсавода, — расказвае намеснік дырэктара Інстытута славянскай філалогіі прафесар Міхал Саевіч. — Я ўпэўнены, што нашы студэнты будуць таксама выдатнымі папулярызатарамі ўсходняй культуры.

Тэлефон для даведак: ***(81) 537 53 78****.*

Глядзіце ў Інтэрнэце: ***www.umcs.lublin.pl***

Агнешка Баровец

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Студэнтка, 23 гады, ахвотна заапякуецца малым дзіцём у Беластоку ў ранніх гадзінах (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 744 52 93.

• Мужчына, 34 гады, электрык, тэхнічная адукацыя, правы кат. АВС, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0604 322 683.

• Жанчына, 49 гадоў, спакойная, без злых схільнасцей, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 661 15 92.

• Пенсіянерка з вопытам у гандлі, санітарны мінімум, знаёмасць фіскальных касаў, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0501 668 475.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, аператыўны, тры месяцы працы ў аптовым складзе агародніны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0604 431 766.

• Вышэйшая эканамічная адукацыя, добрае веданне англійскай і нямецкай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, вопыт у канцылярскай працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0505 951 038.

• Малады мужчына, 28 гадоў, тэхнічная адукацыя, уласная грузавая машына, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0608 151 373.

• Бухгалтар з вопытам шукае працу ў Беластоку, 37 гадоў, правы кат. В, уласная машына, спакойны, без злых схільнасцей, тэл. 0695 736 234.

• Малады мужчына шукае працу ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, правы кат. В, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, тэл. 0501 081 637.

• Студэнтка-завочніца, спакойная, без дрэнных схільнасцей, заапякуецца дзіцём, тэл. 0601 240 086.

• Адказны мужчына, 26 гадоў, сярэдняя тэхнічная адукацыя, вопыт у будаўнічых працах, рамонтах, пільна шукае працу ў Беластоку (сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0504 868 384.

• Абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, сярэдняя адукацыя, правы кат. В, уласная машына, тэл. 0508 638 195.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692 687 442.

• Бармен, санітарны мінімум, кніжка здароўя, праца толькі ў Беластоку (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602 318 086.

• Малады электрамеханік, сярэдняя адукацыя, кніжка здароўя, тэл. 0692 438 475.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе мэблі, пасцелі і адзення для дзяцей у школьным узросце.

• Самотная маці з хворым сынам ва ўзросце 12 гадоў будзе ўдзячная за ўсякую помач пры закупе лякарстваў, галоўная патрэба — інвалідная каляска.

• Сям'і патрэбная мэбля, лёгкае адзенне для хлопцаў ва ўзросце 6, 8 і 13 гадоў.

• Сям'і неабходная дапамога ў лячэнні хворай 13-гадовай дзяўчынкі.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і куртак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Самотная маці з дума сынамі ва ўзросце 10 і 13 гадоў, якая пасля смерці мужа апынулася ў трагічным становішчы, прыме любую дапамогу дзеля стварэння нармальных умоў існавання, прыдасца старая мэбля, халадзільнік, тэлевізар.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка, пасцелі і адзення для дзяцей.

• Сям'я патрабуе старой мэблі, халадзільніка і старых куртак для хлопцаў 14- і 16-гадовага ўзросту.

• Сям'я, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе лёгкага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і 5-гадовай дачкі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

• Аддам тапчан-полку з шафай, тэл. 6518020.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Прадам ужываныя ксераксы, Беласток, тэл. (+48) 888 198 934.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2004 r. upływa 5 czerwca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы” і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб’яўляюць IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з’яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб’ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: IX Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2004 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб’яўлены ў канцы верасня 2004 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на гаранары) на старонках „Нівы”, у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу: **Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 743 50 22.**

Музычныя навіны

Вельмі моцна працуе над новым матэрыялам гурт „Partyzone” (фота). Зараз на сайце http://party-zone.org можна ўзяць дзве новыя кампазіцыі: „Смерці няма” і „Ляці за край”.

Гурт узнік у 1994 годзе ў Мінску. Улетку 1996 г. гурт зрабіў паўнацэнны альбом „Can’t Fly” — узор цудоўнага хард-року з рэшткамі эксперымента. Альбом „Трэба рабіць” быў створаны ў сакавіку-траўні 2002 года і ў той жа час паступіла прапанова ад BMA Group удзельнічаць у hardcore кампіляцыі. Супрацоўніцтва адбылося, прычым з нечаканым працягам: BMA group прапанавалі заняцца таксама прамоцыяй „Partyzone”. Гурт не адмовіўся. Улетку 2002 г. „партызаны” прынялі ўдзел у фэсце беларускай альтэрнатыўнай музыкі „Басовішча”, які адбыўся пад Беластокам у Польшчы 19-20 ліпеня і ўзялі там Гран-пры! Прызом з’явіцца запіс у польскай студыі, які гурт мае намер зрабіць улетку 2004 г.

У снежні 2002 года дзякуючы намаганням BMA group выйшаў даўгачаканы альбом „Трэба рабіць!”. Дыск — мультымедыйны: акрамя аўдыётрэкаў тут вы знойдзеце відэа, фота ды іншае. Зараз каманда займаецца падрыхтоўкай новай праграмы ды час ад часу выступае на розных пляцоўках, у асноўным у Мінску.

Татка Стэп

Вер — не вер...

Астрон, дарагі, во, бачыш, мяса мне прыснілася. Такога цікавага сну я не спадзявалася нават. Каму я, старая і хворая, цяпер патрэбная. Адна я жыву, ды толькі смерці чакаю. А прыснілася, быццам я зусім здаровая і моцная. Знаходзімся мы ў кватэры майго пляменніка і дзелім мяса з яго жонкай.

Кажу табе, Астронку, ніколі ў жыцці я не бачыла такога прыгожага мяска, як у гэтым сне. Во тут ляжаць трусы, з якіх сцягнулі ўсю скуру. Мяска іх беленькае-беленькае. А там далей на прадаўгаватай талерцы ляжаць цялячыя лёгкія. Лёгкія таксама ясненькія і натапырыліся, быццам вушкі труса. Яшчэ далей ляжаць вялікія кавалкі грудзінкі — смачнага бачку.

Усё гэта мы рыхтуем, а я не ведаю нават, з якой нагоды. Ці ў сям’і пляменніка мае адбыцца нейкая ўрачыстасць?.. Бо нешта я ні пра вяселле, ні тым больш пра хрэсьбіны нічога не чула.

Ага, хачу адзначыць, што мяса ўсё-усёнечка было сырое, зваранага мяса нідзе не было відаць нават кавалачка. Не ведаю, ці гэта добра, ці кепска. Сон то ён мой, але што, калі нешта здарыцца з сям’ёй майго пляменніка. Вельмі клапачуся пра яго, бо бацькоў ужо ён не мае, памерлі. Лепш хай бы са мной нешта здарылася. Няхай жа ж бы яны ўжо жылі спакойна.

Настасся

Настасся! Кожны чалавек галаву гатоў аддаць за маладога. Нават калі гэта будзе не яго сын, а толькі пляменнік. У кожнай сям’і наступаюць напераменку лепшыя і горшыя моманты і трэба са стаічным спакоем падрыхтавацца да ўсяго.

Сырое мяса ў тваім сне прадвяшчае хваробу і смутак. А бачыць ці есці ў сне варанае мяса прадвяшчае дабрабыт, поспехі ў справах. Шкада, што табе прыснілася сырое мяса. Маю надзею, што найгоршае вас абміне.

Астрон

Адгаданка

1						
2						
3						
4						
5						
6						
7						

1. купалаўскі мясцовы беларус-небеларус, 2. райцэнтр на ўсход ад Белавежскай пушчы, 3. месца, дзе растуць і разводзяцца ягады, 4. збудаванне ў выглядзе рада прыступак для пад’ёму і спуску, 5. мясцовая разнавіднасць мовы, 6. напр. Сахара, 7. еўрасаюзны цэнтр. **(ш)**

Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлых клетках, чытаемых зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 13 нумара:

Расія, тавар, баран, Кітай.

Рашэнне: **Вясна**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Антону Казлоўскаму** з Гарадка і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

9.05 – 15.05

Баран (21.03. — 19.04.) Калі здарацца нейкія веснавыя флірты, адчуеш сябе найлепш у пастаяннай сувязі. Самотны Баран мае шанц пазнаёміцца з кімсьці інтрыгуючым. Не спадзявайся дасягнненяў самага высокага палёту, але шмат што ўдасца. Добрае самаадчуванне і выгляд.

Бык (20.04. — 20.05.) Дасканала дамовішся з людзьмі. 9 — 12.05. аформіш ва ўстановах кожную справу. Да 18 мая памаленьку можаш справіцца з усім. Сапраўдная апора ў старэйшых у сям’і.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Першая палова месяца — значна лепшая ад другой, таму да 15 мая спраўся з усім важным. Асаблівае шчасце для Блізнят, якія нарадзіліся паміж 11 і 18 чэрвеня.

Рак (22.06. — 22.07.) Навучыся дараваць свайму партнёру. Ракі з 1 да 6 ліпеня выведуць на простую вельмі складаныя справы, якія валакуцца ўжо шмат часу. Ракі з I і II дэкады будуць баявітыя і сварлівыя. Магчымая сварка асабліва з бацькам ці цесцем. У фінансах някепска, але чакай 18.05.

Леў (23.07. — 22.08.) Новыя магчымасці (14 —18.05.) падштурхнуць справы наперад. Асабліва паспяховымі будуць неканвенцыянальныя развязкі. Асцярожна, ёсць асобы, якія толькі чакаюць, каб табе падвінулася нага. Не сварыся з хатнімі. Шукай энергіі ў апдачынку на прыродзе.

Дзева (23.08. — 22.09.) 10 — 14.05. не афармляй важных спраў ва ўстановах ці банках. Спачатку неабходнае, пасля — цяжэйшае. 10 — 12.05. зможаш дагаварыцца з кожным, прыемныя і сімпатычныя кантакты з людзьмі. Шчырая размова з начальнікам пойдзе табе на карысць. Не плануй большых закупак.

Шалі (23.09. — 23.10.) 9 — 12.05. зоркі дададуць табе красы і сімпатыі, будзеш душой кампаніі. Калі захочаш кагосьці падчапіць — не будзеш мець аніякіх цяжкасцей. Увесь месяц іграй на латарэі. Можаш пазнаёміцца 9 — 12.05. з кімсьці надта цікавым. Шмат нагод зарабіць грошы.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Будзеш ззяць інтэлектам і вынаходлівасцю. Сябры будуць цябе інспіраваць. Калі ты шэф, зразумей сваіх падначаленых, а калі твой шэф Скарпіён, заўваж, што і ён чалавек. Прымай удзел у конкурсах і іграх.

Стралец (22.11. — 21.12.) Запрашэнні на імпрэзы. Размах, дынаміка (гэта можа выклікаць зайздрасць калег). Удалыя сустрэчы. Звярні ўвагу на сваё здароўе, правер яго ў лекара.

Казярог (22.12. — 20.01.) Атмасферу на працы можа замяшаць канфлікт з асобай, якая зайздросціць табе поспеху. У жыцці лічыцца не толькі праца! Нечаканыя візіты свякоў. Сон — найлепшая касметыка.

Вадалей (21.01. — 19.02.) 15 мая прыток энергіі — справішся са справамі, якія занялі б табе пару тыдняў. Дома — зразумей, што няма ідэалаў. Калі забаліць галава, прымяняй акупрэсуру (масаж ціскам).

Рыбы (20.02. — 20.03.) Рыбам-матурысткам добра пойдзе на вусных экзаменах. Павыкідай з хаты непатрэбныя рэчы, лягчэй будзе сабраць думкі і запанаваць над хаосам. Шмат дадатковых магчымасцей зарабіць. Калі пазычаеш грошы, дык малыя сумы. Дбай аб свой варштат працы — абсталяванне, камфорт і выгаду.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960